Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 САКАВІКА 2013 г. СУБОТА № 54 (27419) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Для поўнага шчасця сямейнаму дзіцячаму дому Аксаны Андрэевай і Віктара Салаўёва ў Шклове не хапае сваіх «колаў». Бацькі звярнуліся да ўладаў, і тыя паабяцалі вырашыць іх транспартную праблему. СТАР. 3



Ручнікоў вышываных у бабулі Ганны не злічыць. Кожны абраз, кожны партрэт, якімі ў яе завешаны ўсе сцены, аздоблены ручніком. Узоры амаль не паўтараюцца. Але самае цікавае, што вышывае яна і зараз. СТАР. 5



Першым спектаклем, паказаным на магілёўскай сцэне ў рамках VIII тэатральнага форума «M.@rt.кантакт», стала пастаноўка «Рамэа і Джульета» тэатра «На Ліцейным» з Санкт-Пецярбургу. СТАР. 6



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар Кастрычніцкага раёна сталіцы Вадзім НАРАНОВІЧ на прагулцы з 2-гадовымі дочкамі-трайнятамі Верай, Надзеяй і Любоўю.

## ТРЭЦІ СНЕГ ВЕРЫ, НАДЗЕІ І ЛЮБОВІ

Пётр ПРАКАПОВІЧ:

## «ЗАДАЧА — МАДЭРНІЗАВАЦЬ МЫСЛЕННЕ»

**Беларусь сёння мае ўсе ўмовы для эканамічнага рыўка наперад: фінансавыя сродкі, нарматыўную базу, патэнцыял і вопыт. Аднак усяго гэтага можа аказацца недастаткова, калі літаральна кожны грамадзянін Беларусі не асэнсуе, наколькі ад яго асабіста залежыць поспех справы. На гэтай думцы акцэнтаваў увагу журналістаў намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Пётр ПРАКАПОВІЧ на прэс-канферэнцыі, прысвечанай пытанням мадэрнізацыі эканомікі.**



Фота БЕЛТА.

### Што атрымаем у выніку

Комплексная мадэрнізацыя эканомікі ў бліжэйшыя 2 гады дазволіць павысіць жыццёвы ўзровень беларусаў у 2015 годзе да сярэднееўрапейскага, сказаў на прэс-канферэнцыі віцэ-прэм'ер Пётр Пракаповіч. Гэта значыць, што сярэднямесячны заробак у нас будзе $1000. Для гэтага патрэбна, каб вытворчасць працы ў выглядзе выручкі на аднаго занятага ў эканоміцы была не менш за $60 тыс. У 2010 годзе гэты паказчык трохі перавышаў $33 тысячы — а значыць, размова ідзе пра рост вытворчасці працы амаль у 2 разы.

Другі вынік мадэрнізацыі — збалансаванае развіццё знешнеэканамічнай дзейнасці, атрыманне ўстойлівага станоўчага сальда ў знешнім гандлі. Акрамя росту вытворчасці працы, для гэтага патрабуецца яшчэ і павышэнне канкурэнтаздольнасці нашых тавараў на знешніх рынках.

Паспяхова і своечасова праведзеная мадэрнізацыя дазволіць Беларусі да 2020 года ўвайсці ў лік краін сусветнай эліты па ўзроўні развіцця чалавечага патэнцыялу і дабрабыту. «Мы маем магчымасць пры здавальняючай працы ўвайсці ў лік 40 перадавых краін свету, пры добрай працы — у 30», — упэўнены Пётр Пракаповіч.

### Асаблівасці моманту

Калі раней мадэрнізацыя ў нашай краіне адбывалася на асобных прадпрыемствах (10-15%), то зараз урад вырашае задачу забеспячэння мадэрнізацыі ўсіх без выключэння прадпрыемстваў. «Розніца ў разы паміж перадавымі і адсталымі гаспадаркамі недапушчальная», — пакрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

Упершыню таксама размова ідзе пра комплексную мадэрнізацыю: не толькі тэхнічную, але і эканамічную, якая мае на ўвазе ўкараненне самых дасканалых сістэм кіравання, аптымізацыю колькаснага складу, перайманне лепшага сусветнага вопыту.

Яшчэ адна асаблівасць сённяшняга часу — удзел у мадэрнізацыі гаспадарак усіх формаў уласнасці. «Гэта звязана з тым, што роля недзяржаўнага сектара эканомікі значна вырасла, і без мадэрнізацыі ў гэтай сферы мы не дасягнём жаданага выніку, — патлумачыў Пётр Пракаповіч. — Таму асаблівыя ўвага і клопат з боку дзяржавы і ўсяго грамадства будуць надавацца развіццю малога і сярэдняга бізнэсу». У 2015 годзе не менш за 30% ВУП павінна быць створана з удзелам малога (з колькасцю да 100 працоўных месцаў) бізнэсу. Сёння гэты паказчык меншы за 20%. Гэта значыць, што за 3 бліжэйшыя гады эканамічны патэнцыял малых прадпрыемстваў таксама павінен вырасці амаль удвая.

### Што зроблена?

Сёння распрацаваны праграмы па мадэрнізацыі 2820 прадпрыемстваў з дзяржаўнай формай уласнасці. Усяго такіх прадпрыемстваў — 3904. Астатнія не патрабуюць значных капітальных укладанняў, таму замест праграм для іх распрацаваны комплекс мер. Акрамя таго, праграмы па мадэрнізацыі распрацаваны яшчэ на 853 прадпрыемствах міжведамаснай падпарадкаванасці.

Цяпер абараняюцца бізнэс-планы, адкрываюцца крэдытныя лініі, праводзяцца тэндары і закупляецца абсталяванне. Вызначаны крыніцы фінансавання: 1/3 — уласныя сродкі прадпрыемстваў, 50-55% — запазычаныя рэсурсы банкаў, 10-15% — падтрымка дзяржавы і, акрамя таго — прыцягненне прамых замежных інвестыцый.

Эканамічную мадэрнізацыю Пётр Пракаповіч назваў больш важным і больш складаным пытаннем, чым мадэрнізацыю тэхнічную, бо без дадатковых грошай яна можа забяспечыць павелічэнне вытворчасці тавараў і паслуг ад 10 да 50%.

### Спрыяльныя фактары

Першым такім фактарам Пётр Пракаповіч назваў працу ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы, што дае новыя магчымасці для экспарту нашых тавараў і паслуг. Другі аб'ектыўны спрыяльны фактар — скарачэнне выдаткаў на энергарэсурсы з 1 студзеня 2012 года, за кошт чаго толькі летась беларуская эканоміка атрымала каля $4 млрд. Кошт на энергарэсурсы для Беларусі не будзе павялічвацца ў бліжэйшыя 3 гады, што стварае эканамічную аснову для паспяховай мадэрнізацыі.

Такім чынам, усе магчымасці ў нас ёсць, «але ўсё будзе залежаць ад працы кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь», падкрэсліў віцэ-прэм'ер. Па сутнасці, размова ідзе пра мадэрнізацыю мыслення, пагадзіўся ён з журналістамі. «Мы павінны навучыцца жыць і працаваць па-сучаснаму».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ГРУША, дырэктар дэпартамента па ядзернай энергетыцы Міністэрства энергетыкі:**

***«Разлікі, праведзеныя навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук, паказалі, што з пускам Беларускай АЭС сабекошт электраэнергіі ў цэлым па энергасістэме знізіцца прыкладна на 20%. Пры гэтым не ўлічвалася меркаванае павышэнне цэн на газ. Гадавы аб'ём закупак прыроднага газу скароціцца на 4-5 млрд куб.м. Як паказвае аналіз, паліўны складнік у сабекошце вытворчасці электрычнай энергіі на АЭС у свеце зараз ад 12% да 25%, у той час як на звычайных электрастанцыях — каля 70%».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.03.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8630,00 | ▲ |
| Еўра | 11130,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1060,72 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 9° |
| Віцебск | – 10° |
| Гомель | – 11° |
| Гродна | – 9° |
| Магілёў | – 11° |
| Мінск | – 11° |

■ «Прамая лінія»

## ЧЭКАВАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ПРАДОЎЖЫЦЦА ЯШЧЭ НА 3 ГАДЫ

**На пытанні чытачоў газеты падчас «прамой лініі» адказвае старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгій КУЗНЯЦОЎ.**



***— Я памяняў свае чэкі «Маёмасць» на акцыі мясцовага акцыянернага таварыства «Стаўбцоўскі райаграсэрвіс». Потым гэтая структура была прададзена нейкай прыватнай фірме. Няўжо чэкі і акцыі зараз «згарэлі»?***

**Анатоль Ігнатовіч,** *г. Стоўбцы.*

— Вы маеце акцыі ўжо ў новым таварыстве, бо там памяняўся ўласнік. Вашы акцыі не «згарэлі».

***— Аднак, заробкі сабе кіраўніцтва новай структуры зрабіла вялікія, а грошай на дывідэнды не дае.***

— Каб неяк паўплываць на рашэнні гэтага акцыянернага таварыства, вам неабходна наведваць агульны сход акцыянераў і актыўна адстойваць там свае правы.

***— Але, нас там ніхто не слухае. У такіх, як я, толькі 49 працэнтаў акцый...***

— Вам трэба дасканала разабрацца, якім чынам прымаюцца канчатковыя рашэнні аб выплаце дывідэндаў менавіта ў вашым таварыстве. Спецыялісты нашага камітэта, са свайго боку, паспрабуюць пракантраляваць законнасць дзеянняў гэтага акцыянернага таварыства.

***— Раней вашай структурай быў распрацаваны пералік са 103 прадпрыемстваў, якія неабходна прыватызаваць сёлета. Як зараз з гэтымі планамі?***

**Віталь Валанюк,** *г. Мінск.*

— Усё зусім не так. Зараз не існуе ніякіх пералікаў тых прадпрыемстваў, якія неабходна абавязкова прыватызаваць і атрымліваць за гэта вялікія грошы. Кіраўнік дзяржавы дакладна вызначыўся па гэтай тэме. Сёння любое прадпрыемства можа быць прыватызавана. Калі рэальны пакупнік згодны заплаціць за пакет акцый яго рынкавы кошт і збіраецца выконваць пэўныя ўмовы па развіцці прадпрыемства, то праблем з прыватызацыяй не існуе. Набыццё такіх пакетаў акцый ажыццяўляецца адкрыта толькі праз аўкцыён ці конкурс.

***— Аб прыватызацыі якіх буйных прадпрыемстваў зараз можа ісці гаворка?***

— Зараз да прыватызацыі актыўна рыхтуюцца два знакавыя прадпрыемствы краіны. Гэта акцыянернае таварыства «Крыніца» і «Белгіпс». Існуюць праекты і па іншых прадпрыемствах. Яны знаходзяцца ў стадыі абмеркавання. СТАР. 2

■ Трагічная дата

## СХІЛЯЕМ ГАЛОВЫ ПЕРАД ВАМІ, ХАТЫНЦЫ!

**Штодзень у мемарыяльным комплексе «Хатынь» паміж мармуровымі плітамі ходзяць наведвальнікі. Учора, нягледзячы на марознае надвор'е, іх было надзвычай шмат. Прадстаўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання, грамадскіх арганізацый, праваслаўнай і каталіцкай канфесій, школьнікі і сведкі тых страшэнных падзей сабраліся тут, у дзень 70-й гадавіны хатынскай трагедыі, падчас мітынгу-рэквіема.**



Фота БЕЛТА.

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй КАБЯКОЎ** *(на фота)* агучыў зварот Аляксандра Лукашэнкі з нагоды гэтай трагічнай даты. Ад Прэзідэнта краіны, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў, дыпламатычнага корпуса краіны, Беларускай праваслаўнай і Рымска-каталіцкай цэркваў каля Вечнага агню былі ўскладзены вянкі, а каля помніка Няскоранаму чалавеку — кветкі.

— Калі ў 1969 годзе тагачасны кіраўнік беларускай рэспублікі Пётр Машэраў адкрываў мемарыяльны комплекс «Хатынь», ён пакінуў тут памятны запіс: «З той пары, як нацысцкія карацелі ажыццявілі ў Хатыні сваю зверскую акцыю, гэтай вёскі больш няма на геаграфічных картах, але яе ведае ўвесь свет», — зазначыў **старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс БАТУРА**. — Гэтыя словы справядлівыя і сёння. Ва ўсім свеце вядома, якому страшнага генацыду і спусташэнню падвергнуліся беларусы і іх зямля ў гады гітлераўскай акупацыі. Аднак ёсць пэўныя сілы, якія не грэбуюць ніякімі сродкамі дзеля таго, каб свет забыўся пра гэтыя злачынствы. З'явілася шмат літаратуры, дакументальных і мастацкіх фільмаў, дзе гістарычныя факты не толькі фальсіфікаваныя, а перавернутыя з ног на галаву. І вось ужо здраднікі, бандыты і каты паўстаюць у вобразе высакародных барцоў за ідэалы. Гэты вераломны прапагандысцкі меч накіраваны, у першую чаргу, супраць нас — нашчадкаў Вялікай Перамогі. Выкрасліць яе з нашай памяці — пазбавіць нас вялікасці нацыі, якая выратавала чалавецтва ад вынішчэння. Якой цаной дасягнута гэтае выратаванне, сведчыць агонь і попел Хатыні. Памятаючы аб цане Перамогі, мы не павінны забывацца і пра тое, што яна была здабыта, дзякуючы толькі адзінству брацкіх народаў.

Падчас мітынгу-рэквіема Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архіепархіі, архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч і епіскап Барысаўскі, вікарый Мінскай епархіі Веніямін правялі памінальнае богаслужэнне. СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЭКС-ПРЭЗІДЭНТУ ФРАНЦЫІ ПРАД'ЯЎЛЕНА АБВІНАВАЧВАННЕ Ў КАРУПЦЫІ



Былому прэзідэнту Францыі Нікаля Сарказі прад'яўлена абвінавачванне ў тым, што ён незаконна атрымаў грошы ад уладальніцы парфумернай кампаніі L'Oreal Ліліян Бетанкур, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на адваката экс-прэзідэнта. Гаворка ідзе пра сродкі, атрыманыя на перадвыбарчую кампанію 2007 года.

Абвінавачванне Нікаля Сарказі было прад'яўлена пасля допыту і вочнай стаўкі з супрацоўнікамі. У прыватнасці, у вочнай стаўцы ўдзельнічаў былы дварэцкі ўладальніцы L'Oreal. Следчыя спрабуюць высветліць, колькі разоў былы кіраўнік дзяржавы сустракаўся з самай багатай жанчынай Францыі. Сам экс-прэзідэнт сцвярджае, што рабіў гэта толькі аднойчы, аднак людзі з асяроддзя Ліліян Бетанкур кажуць, што сустрэч было некалькі. Раней абвінавачванні па гэтай справе былі прад'яўлены 17 чалавекам. Паводле інфармацыі следства, Нікаля Сарказі атрымаў ад Ліліян Бетанкур 150 тыс. еўра, тады як па французскіх законах кандыдат у прэзідэнты не можа прымаць ад прыватных асоб ахвяраванні, якія перавышаюць 4,6 тыс. еўра. У лістападзе 2012 года Нікаля Сарказі быў запрошаны на першы допыт, які доўжыўся 12 гадзін. Па яго выніках з падазраванага былы прэзідэнт быў перакваліфікаваны ў сведку. Аднак судовы следчы, які вёў справу, даў зразумець, што пытанні да экс-прэзідэнта Францыі не вычарпаны.

### ВАЕННАЯ РАЗВЕДКА ЗША: УЛАДЫ СІРЫІ НЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЛІ ХІМІЧНУЮ ЗБРОЮ

Амерыканскія вайскоўцы маюць інфармацыю аб тым, што сірыйскія ўлады не выкарыстоўвалі хімічную зброю, у чым Дамаск абвінавачвае ўзброеная апазіцыя, паведамляе тэлеканал CNN.

У аўторак сірыйскія ўлады ўпершыню заявілі, што ўзброеная апазіцыя выкарыстала хімічную зброю ў правінцыі Алепа. Ахвярамі нападу сталі 25 чалавек, яшчэ 110 сур'ёзна пацярпелі. Апазіцыянеры, у сваю чаргу, абвінавацілі ў выкарыстанні хімічнай зброі Дамаск. У чацвер генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун абвясціў аб пачатку расследавання інцыдэнту па просьбе ўлад Сірыі. Пасля гэтага Францыя і Вялікабрытанія папрасілі яго расследаваць усе паведамленні аб прымяненні хімічнай зброі ў Сірыі. «Цяпер у нас ёсць сур'ёзныя доказы таго, што хімічная зброя не была выкарыстана ўладамі ў апошнія дні», — паведаміў са спасылкай на разведвальную інфармацыю суразмоўца CNN. Разведка таксама не можа пацвердзіць заявы ўлад аб выкарыстанні хімічнай зброі баевікамі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### РЭФЕРЭНДУМ АБ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ШАТЛАНДЫІ ПРОЙДЗЕ Ў 2014 ГОДЗЕ



**Кіраўнік шатландскага рэгіянальнага ўрада Алекс Сэлманд абвясціў, што рэферэндум па пытанні аб незалежнасці Шатландыі пройдзе 18 верасня 2014 года, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Удзельнікам рэферэндуму трэба будзе адказаць на адно пытанне: «Ці павінна Шатландыя быць незалежнай дзяржавай?».

Алекс Сэлманд падкрэсліў, што цяперашняе пакаленне шатландцаў атрымала вялікую прывілею — самастойна вызначыць будучыню сваёй краіны на доўгія гады.

Левая апазіцыя, якая выступае за захаванне Шатландыі ў складзе Вялікабрытаніі, раскрытыкавала выбар даты, палічыўшы яе занадта аддаленай.

Паводле вынікаў сацыялагічных апытанняў, каля 30% шатландцаў, якія маюць права голасу, падтрымліваюць незалежнасць Шатландыі. За захаванне статус-кво выступаюць крыху менш за палову апытаных. Умовы правядзення рэферэндуму ўжо агавораны на афіцыйным узроўні ўрадамі Шатландыі і Брытаніі.

КОРАТКА

Беларусь учора ў мэтах выканання сваіх абавязацельстваў па крэдыце стэнд-бай Міжнароднага валютнага фонду ажыццявіла пагашэнне асноўнага доўгу ў памеры 54,7 млн СДР, што эквівалентна $82,2 млн.

ДАІ просіць вадзіцеляў быць вельмі ўважлівымі на дарогах у сувязі з пачаткам школьных канікул. Менавіта ў гэтыя дні бесклапотныя паводзіны прадстаўленых самім сабе дзяцей часта становяцца прычынай дарожных здарэнняў.

Прыпяць у паўднёвым рэгіёне Гомельскай вобласці пачынае вызваляцца ад ледзянога покрыва. Каб выключыць падтапленні, супрацоўнікі МНС сумесна са службай грамадзянскай абароны і работнікамі рачнога порта «Пхоў» пачалі ліквідацыю затораў з дапамогай ледакола «Сібір».



Фота БЕЛТА.

Квіткі на чэмпіянат свету па хакеі, які пройдзе ў Мінску ў 2014 годзе, будуць каштаваць ад 10 еўра. На фінальныя матчы — у памеры 250 еўра. Мяркуецца, што продаж квіткоў на чэмпіянат свету пачнецца ў верасні.

## ПРАФСАЮЗЫ СУПРАЦЬ ПАВЫШЭННЯ ПАДАТКОВАЙ НАГРУЗКІ НА РАБОТНІКАЎ

**Ва ўрадзе зноў абмяркоўваюцца перспектывы павышэння адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) з заробкаў беларусаў.**

Як стала вядома, у Саўміне прайшла нарада па паляпшэнні ўмоў вядзення дробнага бізнэсу, у рамках якой быў сфарміраваны план дзеянняў. На думку яго складальнікаў, ён дасць магчымасць павысіць рэйтынг Беларусі ў справаздачы Сусветнага банка «Вядзенне бізнэсу».

Адным з пунктаў гэтага плана з'яўляецца ўжо ў 2013 годзе зніжэнне адлічэнняў у ФСАН для гаспадароў арганізацый малога бізнэсу і павышэнне падатковай нагрузкі на работнікаў. Сёння работнік выплачвае ў ФСАН 1% ад заработнай платы штомесяц, наймальнік ці гаспадар арганізацыі — 34%. Якім чынам прапануецца пераразмеркаваць нагрузку, ва ўрадавым плане дзеянняў не ўдакладняецца. Аднак яшчэ зусім нядаўна Саўмін прапаноўваў ускласці на работніка 16%, а на наймальніка — 19%.

Калі ўзяць за аснову менавіта гэтыя лічбы, то пры сярэдняй заработнай плаце па краіне 4 368 000 рублёў замест сённяшніх 43 тыс. рублёў работніку давядзецца штомесяц адлічваць амаль 700 тысяч, што за год складзе больш за 8 млн рублёў.

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі неаднаразова выказвала сваю прынцыповую пазіцыю ў дачыненні да гэтага пытання. **Старшыня ФПБ Леанід КОЗІК** заявіў: «Нельга дапускаць лабіравання ўрадам інтарэсаў малога бізнэсу ў шкоду інтарэсам больш за 5 мільёнаў работнікаў, якія забяспечваюць ВУП, плацяць падаткі і якім жывецца нялёгка, улічваючы пастаянны рост коштаў на тавары і паслугі. ФПБ катэгарычна супраць змены існуючага парадку адлічэнняў у ФСАН». Старшыня ФПБ сцвярджае, што сваю пазіцыю прафсаюзы заяўлялі неаднаразова. «Напэўна, менавіта па гэтай прычыне гэтую тэму ў Саўміне на гэты раз абмяркоўвалі без прадстаўнікоў ФПБ», — дадаў ён.

**Святлана БУСЬКО.**

## СХІЛЯЕМ ГАЛОВЫ ПЕРАД ВАМІ, ХАТЫНЦЫ!



Фота БЕЛТА.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

**Сведка тых страшных падзей Соф'я ДАРАШЭЎСКАЯ** расказала, што яе родную вёску Угалец, што знаходзілася ў Пухавіцкім раёне, немцы палілі двойчы. «Пасля другога запалу аднавіць яе не ўдалося: з 130 дамоў не засталося ні хатачкі. Мяне, 5-гадовую дзяўчынку, разам з брацікамі і сястрычкамі маці хавала ў лесе. У той час, як гітлераўцы палілі вёску, мы, малыя, як звычайна, туліліся ў халоднай зямлянцы. Пашчасціла не загінуць і іншым некаторым жыхарам вёскі. Наша вёска пацярпела, як і многія іншыя. Толькі, на жаль, яе няма ні ў адным спісе спаленых у вайну населеных пунктаў».

— Ушанаваць памяць спаленых жыхароў Хатыні — ушанаваць памяць усіх, хто загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны, — перакананы **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Анатоль НОВІКАЎ**. — Хатынь — толькі адна з тых трагічных мясцін беларускай зямлі. Хацелася б, каб у сучаснай моладзі было імкненне глыбей даведацца пра гісторыю сваёй Радзімы, трагедыю і гераізм беларускага народа. Хаця б для таго, каб ні адзін гісторык ці журналіст, які спрабуе прынізіць ролю савецкага народа ў вайне, не змог пераканаць іх перакручанымі фактамі. Гісторыю нельга перапісваць, яе трэба вывучаць.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ХАЦУНЬ — БРАНСКАЯ ХАТЫНЬ

**У прадстаўніцтве Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь — Расійскім цэнтры навукі і культуры ў Мінску — успаміналі пра самыя сумныя моманты нашай агульнай гісторыі — трагедыі мірнага насельніцтва, якое стала ахвярай ваеннага ліхалецця ў перыяд Вялікай Айчыннай. 70 гадоў таму фашыстамі была спалена вёска Хатынь: журботны боль і сёння сціскае сэрцы беларусаў. Падзяляюць гэты невыносны боль і славянскія браты з Расіі і Украіны. І там у час нашэсця «карычневай чумы» былі свае Хатыні.**

**Кіраўнік прадстаўніцтва федэральнага агенцтва па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой, і па міжнародным гуманітарным супрацоўніцтве (Рассупрацоўніцтва), саветнік Пасольства Расіі ў Беларусі Віктар МАЛАШЭНКА** адкрыў вечар-рэквіем просьбай не забываць пра самыя страшныя моманты мінулай вайны. Інакш гісторыя крывавых бесчалавечных распраў можа паўтарыцца. Ён з горыччу расказваў прысутным аб тым, што ў час Вялікай Айчыннай адбывалася на яго малой радзіме — у Бранскай вобласці. За гады вайны гітлераўцы знішчылі тут больш як 75 000 мірных савецкіх грамадзян. Больш за дзясятак мясцовых вёсак перажылі лёс Хатыні.

Пра гібель адной з іх падчас мерапрыемства расказаў госць з Расіі — намеснік **дырэктара Бранскага аб'яднанага краязнаўчага музея, заслужаны работнік культуры Расійскай Федэрацыі Уладзімір АЛЯКСЕЕЎ:**

— 24 кастрычніка 1941 года ў вёсцы Хацунь Верхапольскага савета некалькі чырвонаармейцаў, якія выходзілі з акружэння, напалі на траіх фашыстаў і вызвалілі групу з шасці ваеннапалонных. Двое немцаў былі забіты, а трэці, паранены, паспеў уцячы ў лес. А на досвітку 25 кастрычніка вёску акружылі карнікі. Фашысты сагналі ў адно месца жыхароў вёскі і бежанцаў з Бранска і расстралялі ўсіх з кулямётаў. Шасцімесячную Ніну Кандрашову праткнулі штыком у люльцы, а сямнаццацігадовую Ніну Яшыну, знайшоўшы ў яе нейкую рэч забітага чырвонаармейцамі немца, прыбілі цвікамі да варот. Першым расстралялі перад народам лесніка з урочышча Гвазды Герасіма Тарасава, пасля — яго 29-гадовага сына Ілью. Наступным загінуў ляснік з Фралоўскага пасёлка Міхаіл Кандрашоў. А пасля сталі расстрэльваць усіх астатніх.

318 чалавек забілі, а вёску спалілі. Целы расстраляных праляжалі пад адкрытым небам каля двух тыдняў. Хаваць загінулых жыхарам навакольных вёсак немцы забаранялі. Адзінкі выратаваліся ў гушчары лесу. Хацунь стала адной з першых ахвяр нямецкага генацыду на савецкай зямлі. Яе лёс паўтарылі 12 населеных пунктаў Бранскай вобласці, а ўсяго за гады акупацыі на Браншчыне фашыстамі было знішчана 930 вёсак.

У 1977 годзе было прынята рашэнне аб стварэнні ў Хацуні мемарыяльнага комплексу ў памяць аб ахвярах фашызму. Аднак першапачатковы праект не быў цалкам ажыццёўлены.

У 2009 годзе пачаліся работы па поўнай рэканструкцыі мемарыяла. Адкрыццё абноўленага мемарыяльнага комплексу адбылося 25 кастрычніка 2011 года — у дзень 70-годдзя хацунскай трагедыі. Ва ўрачыстым мерапрыемстве ўзялі ўдзел тагачасны старшыня ўрада Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, дэлегацыі суседніх рэгіёнаў Беларусі і Украіны.

...Напрыканцы сустрэчы ў Рассупрацоўніцтве старшыня Каардынацыйнага савета кіраўнікоў беларускіх грамадскіх аб'яднанняў расійскіх суайчыннікаў Іван Міхайлавіч Корда заклікаў усіх максімальна беражліва ставіцца да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, аберагаць яе ад усялякіх магчымых спроб рэвізіянізму і фальсіфікацый.

**Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.**

■ 24 сакавіка — Сусветны дзень барацьбы з туберкулёзам

## ШАНЦ НА ВЫЛЕЧВАННЕ

**На фоне агульнага зніжэння захваральнасці на туберкулёз расце ўзровень выпадкаў туберкулёзу, устойлівага да лекаў. Штогод у Беларусі выяўляецца каля 2 тысяч новых такіх пацыентаў. Гэта фактычна кожны трэці з тых, у каго ўпершыню выяўляецца захворванне.**

Паводле слоў **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі — начальніка аддзела пярвічнай медыка-санітарнай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людмілы ЖЫЛЕВІЧ,** наколькі актыўна чалавецтва змагаецца з палачкай Коха, настолькі актыўна і сам туберкулёз процістаіць гэтаму змаганню. Палачка Коха набывае ўстойлівасць да лекаў, а гэта азначае з'яўленне пацыентаў з мульцірэзістэнтным туберкулёзам, калі ніводзін з прызначаных прэпаратаў не здольны аказаць належнае ўздзеянне, а значыць, шанцы на вылечванне істотна зніжаюцца. Такому пацыенту даводзіцца прымаць хіміятэрапію на працягу 2 гадоў, і перапынкі проста недапушчальныя. Частцы такіх пацыентаў прапануецца ўжо толькі паліятыўная дапамога.

За 15 гадоў смяротнасць ад туберкулёзу знізілася ў краіне на 30 працэнтаў. І гэта дасягаецца вялікімі грашовымі ўкладаннямі. Асабліва калі ўлічыць, што ёсць выпадкі спалучэння ВІЧ-інфекцыі і туберкулёзу. ВІЧ-інфіцыраваныя, як вядома, маюць больш высокую рызыку захварэць на туберкулёз. Група такіх пацыентаў расце і патрабуе асаблівага стаўлення, яшчэ большых эканамічных затрат. Дарэчы, на барацьбу з інфекцыяй выдаткоўваюцца не толькі бюджэтныя сродкі, але і сродкі Глабальнага фонду па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. На 2014-15 гады фонд прапануе нашай краіне каля 8 млн долараў, і дадаткова плюс яшчэ 1 млн долараў на лячэнне менавіта мульцірэзістэнтнага туберкулёзу.

Дарэчы, зараз, згодна з адпаведным законам, прынятым летась, інфекцыйныя хворы абавязаны вытрымліваць пэўныя правілы паводзін у грамадстве, а таму, калі ён не выконвае прызначэнні ўрача і адмаўляецца ад лячэння, яго шпіталізуюць у спецыяльныя лячэбныя ўстановы для прымусовага лячэння. У некаторых краінах па меры зніжэння колькасці новых выпадкаў туберкулёзу такая мера адпала. Мяркуецца, што і ў нашай краіне з цягам часу такая мера можа перастаць быць запатрабаванай.

Непасрэдна 24 сакавіка па краіне пройдзе акцыя «Белы рамонак». Ва ўсіх абласных і некаторых райцэнтрах валанцёры Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа будуць расказваць пра захворванне і раздаваць папяровыя белыя кветкі — сімвал барацьбы з туберкулёзам. Усё ж такі туберкулёз і праз 130 гадоў пасля выяўлення палачкі Коха застаецца той інфекцыяй, якая пагражае любому.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Здарэнні

### СВІННЮ ПАЛАЖЫЛІ

ў багажнік «ВАЗа». Там супрацоўнікі батальёна ДПС гомельскага ДАІ і знайшлі жывую жывёлу. Дарэчы, міліцыянеры спынілі «жыгулі» ў абласным цэнтры. Кіроўца і яго пасажыры ні дакументаў, ні выразных тлумачэнняў на пытанне «адкуль парася?» даць не маглі. Таму ўсю кампанію даставілі ў аддзяленне міліцыі Савецкага раёна Гомеля. Дарэчы, летась на Гомельшчыне з «жыгулёў» выцягвалі... карову. Хто будзе наступным?

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ЧЭКАВАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ПРАДОЎЖЫЦЦА ЯШЧЭ НА 3 ГАДЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Ці магчыма перааформіць чэкі «Маёмасць» на чэкі «Жыллё»?***

**Надзея Філіпаўна,** *г. Мядзел.*

— Не. У свой час грамадзяне мелі права перааформіць чэкі «Жыллё» на чэкі «Маёмасць». Потым, да 1 студзеня 2007 года, магчыма было здзейсніць і адваротнае пераафармленне. Зараз такую працэдуру ўжо не робяць.

***— А што мне рабіць з гэтымі чэкамі?***

— Вам трэба звярнуцца ў мясцовае аддзяленне Беларусбанка. Там ёсць спісы акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх прапануюцца ў абмен на чэкі «Маёмасць». Вам неабходна самастойна выбраць тое прадпрыемства, акцыі якога вы жадаеце атрымаць. Потым спецыялісты банка афармляюць абмен і выдаюць вам акцыі.

***— Добры дзень Георгій Іванавіч. Збіраюся абмяняць свае чэкі «Маёмасць» на акцыі. Але што я буду мець з гэтых акцый?***

**Уладзімір Сцяпанавіч,** *г. Мінск.*

— Калі выбранае вамі прадпрыемства дзейнічае з прыбыткам, то на гэтыя акцыі ўладальнікам такіх каштоўных папер выплачваюць дывідэнды.

***— Мне знаёмыя кажуць, што амаль усе акцыянерныя таварыствы, спісы якіх ёсць у Беларусбанку, зараз стратныя...***

— Гэта не зусім так. У пэўных прадпрыемстваў зараз фінансавыя цяжкасці, што звязана і з фінансавым крызісам у свеце. Таму яны часова не маюць магчымасці плаціць нейкія грошы па акцыях. Вам трэба спадзявацца, што эканоміка нашай краіны з цягам часу запрацуе лепш. Магчыма, вашы дзеці ці ўнукі змогуць атрымліваць па гэтых акцыях ужо сур'ёзныя дывідэнды.

***— А як выбіраць менавіта перспектыўныя акцыянерныя таварыствы? Ці маюць шанц на фінансавы дабрабыт будаўнічыя арганізацыі?***

— Пра ўсю будаўнічую галіну адказаць цяжка. Толькі вы асабіста выбіраеце тое мясцовае прадпрыемства, акцыі якога збіраецеся атрымаць. Я сам толькі тры тыдні таму абмяняў свае чэкі на акцыі. Мой выбар спыніўся на прадпрыемстве, дзейнасць якога звязана з сельскай гаспадаркай.

***— А якое таварыства вы выбралі?***

— Гэта абласное прадпрыемства, якое займаецца гатункавым насеннем агародніны.

***— А магу я ўзяць чэкі «Маёмасць» свайго бацькі і абмяняць іх у банку на акцыі?***

— Не. Валодае квотамі прыватызацыйных чэкаў ваш бацька. Таму ён і павінен прыйсці ў Беларусбанк для абмену чэкаў на акцыі. Потым гэтыя акцыі магчыма перааформіць на ваша імя. Як варыянт, можна аформіць даверанасць на бацькоўскія чэкі на ваша імя.

***— Раней казалі, што чэкавая прыватызацыя будзе завершана сёлета 30 чэрвеня. Гэта так? Чуў, што для тых, хто свае налічаныя імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць» на акцыі не абмяняў, дзяржава будзе прапаноўваць пэўную кампенсацыю за чэкі...***

**Ігар Малышка,** *г. Мінск.*

— Адразу адзначу, што пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 111 тэрмін абарачэння імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» працягнуты да 30 чэрвеня 2016 года. Абмен прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» ажыццяўляецца толькі праз аддзяленні Беларусбанка па месцы жыхарства, дзе адкрыты спецыяльныя чэкавыя рахункі на грамадзян. Сёння ў кожным аддзяленні Беларусбанка існуе пералік адкрытых акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх прапануюцца для абмену. Зараз на чэкі маёмасць можна абмяняць акцыі каля 40 акцыянерных таварыстваў з доляй дзяржавы. Сапраўды, калі дзяржава вырашыць завяршыць чэкавую прыватызацыю, то заканадаўствам прадугледжана пэўная кампенсацыя насельніцтву за нявыкарыстаныя чэкі «Маёмасць». Падобная кампенсацыя прадугледжвае выкуп у насельніцтва чэкаў «Маёмасць» па намінальным кошце.

Тут адразу заўважу, што для правядзення такога выкупу ў дзяржавы павінна быць дастаткова свабодных фінансавых сродкаў. Зараз аб правядзенні такой буйнамаштабнай акцыі пытанне нават не абмяркоўваецца. Таму я вам параіў бы не чакаць нейкай кампенсацыі, а ўжо зараз абменьваць чэкі на акцыі айчынных прадпрыемстваў. Людзі ва ўсім свеце ўжо даволі працяглы час валодаюць акцыямі акцыянерных таварыстваў, больш актыўна ўдзельнічаюць у кіраванні гэтымі прадпрыемствамі, атрымліваюць за акцыі дывідэнды.

***— Ці мае права мой дзед даць мне чэкі «Маёмасць»?***

— Чэкі «Маёмасць» можна падарыць ці аформіць у спадчыну блізкім сваякам (бацькі, дзеці, муж, жонка, родныя браты і сёстры, унукі, дзед і бабуля).

***— А ці магчыма зарабіць нейкія грошы на такіх акцыях?***

— На рынку каштоўных папер магчыма зарабляць, аднак памер дывідэндаў, якія выплачваюць на большасці таварыстваў, зараз не вельмі радуе.

Разам з тым, адсутнасць дывідэндаў яшчэ не азначае, што прадпрыемства вельмі «слабое». У большасці выпадкаў увесь прыбытак прадпрыемства накіроўвае на мадэрнізацыю вытворчасці, удасканальванне тэхналагічнага працэсу і на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў. Такія дзеянні таварыства станоўча паўплываюць на ліквіднасць акцый такіх прадпрыемстваў, пасля чаго іх рынкавы кошт істотна павялічваецца. Напрыклад, рэальная цана акцый на рынку зараз ад 2 да 10 разоў больш за іх першапачатковы намінальны кошт.

Таму зарабляць грошы зараз магчыма пры продажы акцый. Тут адзначу, што з 1 студзеня 2011 года грамадзяне могуць свабодна распараджацца любымі акцыямі адкрытых акцыянерных таварыстваў.

Існуе толькі адно «але». На сайце Дзяржкаммаёмасці (www.gki.gov.by) і сайтах аблвыканкамаў (Мінскага гарвыканкама) існуе пералік адкрытых акцыянерных таварыстваў, па якіх існуюць абмежаванні па адчужэнні акцый.

***— Георгій Іванавіч, вас з Лепеля турбуюць. У мяне засталося шмат чэкаў ад сваякоў. Ці магу я абмяняць усе гэтыя чэкі на акцыі?***

**Аляксей Беляеў,** *Віцебская вобласць.*

— Для абмену праз аддзяленні Беларусбанка можна выкарыстоўваць не толькі чэкі, што былі атрыманы грамадзянінам асабіста, але дазваляецца ўжываць і чэкі, атрыманыя ў спадчыну, а таксама да 250 чэкаў «Маёмасць», атрыманых ад блізкіх сваякоў.

***— Так адбылося, што ў сувязі з цяжкай хваробай наша сям'я своечасова не атрымала чэкі «Маёмасць». Ці магчыма іх атрымаць зараз?***

**Ірына Сіманава,** *г. Маладзечна.*

— Выдача імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» скончылася 1 ліпеня 1997 года. Зараз атрымаць гэтыя чэкі ўжо немагчыма.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### МІНСК ЗАЦІКАЎЛЕНЫ Ў ПАШЫРЭННІ ЭКСПАРТНЫХ ПАСТАВАК НА ЎКРАІНСКІ РЫНАК

**Пасол Беларусі ва Украіне Валянцін Вялічка запланаваў сустрэчу з кіраўнікамі тых прадпрыемстваў сталіцы, якія асабліва актыўна развіваюць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з Украінай.**

Гэтая сустрэча арганізавана Мінскім аддзяленнем Беларускай гандлёва-прамысловай палаты і мэрыі сталіцы.

Мерапрыемства адбудзецца 25 сакавіка а 11.00 гадзіне ў памяшканні БелГПП па адрасе: вул. Камуністычная, 11, 2-і паверх. Падчас сустрэчы будзе праведзены абмен думкамі аб стане і перспектывах супрацоўніцтва з Украінай, пашырэнні беларускага экспарту, а таксама плануецца абмеркаваць пытанні ўзаемадзеяння беларускіх прадпрыемстваў з Пасольствам Беларусі ва Украіне ў мэтах падтрымкі экспартных паставак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ПРА ШТО РАСКАЖА АЎДЫЯГІД?

**Новы турыстычны маршрут па Ашмянскім узвышшы плануецца стварыць сёлета дзякуючы беларуска-літоўскаму праекту трансгранічнага супрацоўніцтва «Два бакі — адна гісторыя і культура».**

Гэты праект (кошт яго беларускай часткі складае 65,7 тысячы еўра) скіраваны на развіццё сучасных турысцка-інфармацыйных сістэм. У прыватнасці, будзе створана віртуальная версія вышэйзгаданага турыстычнага маршруту ў фармаце 3D. У знаёмстве з гісторыяй Ашмяншчыны, у тым ліку гасцям з замежжа, дапаможа і аўдыягід, якім будзе аснашчаны мясцовы краязнаўчы музей. Акрамя таго, у рамках праекта мяркуецца выдаць турыстычны даведнік, карты гістарычных аб'ектаў, паштоўкі, каталог «Майстры памежнага рэгіёна» і іншыя друкаваныя матэрыялы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### «ДАРАГІ» БУКЕТ ПРАЛЕСАК...

**Невялічкі букет першых веснавых кветак у Беларусі можа каштаваць ад 2 да 5 мільёнаў рублёў. Гэтую суму давядзецца аддаць у тым выпадку, калі вы вырашылі «прыдбаць» гэты самы букецік у лесе.**

Па інфармацыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у Беларусі растуць такія першацветы, як пралескі, падснежнікі, майскія ландышы. Сярод першацветаў, якіх можна сустрэць на тэрыторыі нашай краіны, ёсць і расліны з Чырвонай кнігі Беларусі. Напрыклад, сон лугавы, сон раскрыты, анемон лясная, пярэсна еўрапейская і іншыя. Збіраць такія расліны забаронена, за невыкананне гэтага правіла чалавеку пагражае вышэйзгаданы штраф.

У Мінпрыроды раяць не рваць першацветы і не набываць іх у гандляроў. Своеасаблівая «гарадская традыцыя» — прынесці дадому колькі першых веснавых кветак — не самым лепшым чынам адбіваецца на іх колькасці ў прыродзе. Чым больш першацветаў зрываюць людзі вясной, тым менш кветак вырасце ў наступным годзе. Масавы збор дрэнна ўплывае на іх папуляцыю, а таксама на здольнасць да вегетацыі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

### ТЭЛЕВІЗАРЫ «З-ПАД КРЫСА» АД ТАМАДЫ

**Супрацоўнікі падатковай інспекцыі Першамайскага раёна сталіцы разам з аператыўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Першамайскага РУУС затрымалі 38-гадовага індывідуальнага прадпрымальніка, які афіцыйна працаваў арганізатарам свят. Як высветлілася, праца тамадой была для мужчыны не адзінай крыніцай даходаў.**

— Акрамя правядзення забаўляльных мерапрыемстваў, ён займаўся і падпольным продажам тэлевізараў, — паведаміла прэс-сакратар Першамайскага РУУС Вольга Куцько. — Тавар набываў у Польшчы, пасля чаго ў інтэрнэце размяшчаў аб'явы аб продажы. Пакупнікі знаходзіліся хутка, паколькі кошт тэлевізараў быў меншы за рынкавы. На адну з такіх аб'яў і натрапілі падатковыя інспектары і аператыўнікі. Яны ж выступілі ў якасці патэнцыяльных пакупнікоў. У выніку падпольны гандляр быў затрыманы на сваёй кватэры «на гарачым». Пры аглядзе жытла праваахоўнікі знайшлі і канфіскавалі 9 тэлевізараў вядомых замежных марак. Кошт канфіскаванага тавару перавысіў 78 мільёнаў рублёў. Меру пакарання парушальніка заканадаўства вызначыць суд.

### «НАВАТАРСКІ» ПРЫЁМ: МЕТАЛ — НА СПІРТ

**Супрацоўнікі АБЭЗ Цэнтральнага РУУС сталіцы і раённай падатковай інспекцыі ў прыватным доме па вуліцы Наватарскай выявілі нелегальны пункт скупкі лому каляровых і чорных металаў. Гэтую дзейнасць без адпаведнай дзяржаўнай рэгістрацыі вёў 27-гадовы гаспадар дома.**

Паводле інфармацыі РУУС, падчас агляду жытла і прылеглай тэрыторыі былі знойдзены прадметы з каляровага і чорнага металаў, «бэўшныя» акумулятары, жалезны лом агульнай вагой амаль 2 тоны на суму каля 5 мільёнаў рублёў. Праваахоўнікі ўстанавілі, што дзейнасць па прыёмцы і адгрузцы металу вялася кругласутачна. Двор дома і прылеглая тэрыторыя былі завалены рознымі металаканструкцыямі, што адслужылі свой век, а глеба — добра «акроплена» акумулятарнымі кіслотамі і іншымі тэхнічнымі вадкасцямі. Варта таксама сказаць, што «прадпрымальнік» прыдумаў і адмысловую форму разліку са сваімі кліентамі за здадзены лом: у якасці аплаты выкарыстоўваўся спірт і іншыя алкагольныя напоі. Дарэчы, многімі здатчыкамі яны ўжываліся тут жа на месцы, што, вядома, не магло радаваць суседзяў.

Па словах затрыманага, раней ліцэнзія на права займацца такім відам дзейнасці ў яго была. Аднак тэрмін дзеяння гэтага дакумента скончыўся два месяцы таму. Праверка ў дачыненні да маладога чалавека працягваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЦІ ЗНОЙДЗЕЦЦА Ў ДЗІЦЯЧЫХ САДКАХ МЕСЦА ДЛЯ СЯМІГОДАК?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Хто можа працаваць на пасадзе выхавальніка ва ўстановах дашкольнай адукацыі? Любы спецыяліст з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй або толькі спецыяліст з профільнай педагагічнай адукацыяй? Ці мэтазгодна ствараць сямейныя дзіцячыя міні-садкі на першых паверхах шматкватэрных дамоў? Ці ёсць патрэба ў стварэнні ў дашкольных установах дзяжурных груп, якія будуць працаваць як мінімум да 20 гадзін? Якія органы самакіравання ва ўстановах дашкольнай адукацыі можна было б аб'яднаць? Наколькі мэтазгодна ствараць ва ўстановах дашкольнай адукацыі групы, у якіх будзе забяспечвацца толькі догляд дзяцей? Якой павінна быць напаўняльнасць груп у дзіцячых садках? З гэтымі і іншымі пытаннямі члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы вырашылі звярнуцца да кіраўнікоў устаноў адукацыі, педагогаў і бацькоў.**

Да 1 жніўня ў Беларусі праходзіць маніторынг праваўжывальнай практыкі Кодэкса аб адукацыі на прадмет магчымай карэкціроўкі вышэйназванага дакумента або канкрэтызацыі і дэталізацыі пэўных яго фармулёвак. У гэтай сувязі Парламенцкая камісія па адукацыі, культуры і навуцы мае намер правесці серыю пашыраных пасяджэнняў з прадстаўнікамі абсалютна ўсіх узроўняў адукацыі — ад дашкольнай да дадатковай.

— Для нас вельмі важна пачуць меркаванне практыкаў, — падкрэсліў **старшыня камісіі Генадзь ПАЛЬЧЫК.** — Не буду ўтойваць, што ў камісію паступае шмат прапаноў. Найбольшая колькасць прапанаваных карэкціровак датычыцца агульнай сярэдняй адукацыі. Мяркуем, што не ўсе пытанні трэба вырашаць шляхам унясення змяненняў у Кодэкс. Некаторыя з іх могуць быць вырашаны і на ўзроўні іншых галіновых дакументаў.

Першае пасяджэнне прайшло днямі ў сценах Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка і было прысвечана арганізацыі работы дашкольнай адукацыі. Да ўдзелу ў дыскусіі былі запрошаны спецыялісты Міністэрства адукацыі, упраўленняў адукацыі, вядучыя вучоныя і эксперты Нацыянальнага інстытута адукацыі, прадстаўнікі інстытутаў развіцця адукацыі і рэспубліканскага савета загадчыкаў устаноў дашкольнай адукацыі. Усім было прапанавана прыняць удзел у анкетаванні, ад вынікаў якога будуць залежаць канкрэтныя рашэнні. Анкетаваннем плануецца ахапіць таксама як звычайных выхавальнікаў, так і законных прадстаўнікоў дзяцей. Пытанні і педагогам, і бацькам будуць прапаноўвацца вельмі падобныя. Для прыкладу, і першым, і другім прапанавана даць адказ на наступнае пытанне: **«Ці лічыце вы магчымым заключэнне дагавора паміж законнымі прадстаўнікамі дзіцяці і ўстановай дашкольнай адукацыі, у якім будзе ўстаноўлена сума штогадовага ўзносу на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ўстановы адукацыі?»** Цікава, як адкажуць на яго бацькі, якія неаднаразова скардзіліся на пастаянныя паборы ў дзіцячых садках і самі ж выказваліся за ўвядзенне пэўнай фіксаванай сумы матэрыяльнай «дапамогі»?

Можна не сумнявацца, што пытанні, на якія звярнулі ўвагу ўдзельнікі пасяджэння, не пакінуць бацькоў абыякавымі. Для прыкладу, ёсць меркаванне, што ў бацькоў нярэдка прысутнічае спажывецкае стаўленне да дашкольнай адукацыі. Паводле Кодэкса, навучанне ў першым класе сёння можа пачынацца і ў 6, і ў 7 гадоў. Вось гэты год і стаў «каменем спатыкнення»: некаторыя бацькі імкнуцца прадоўжыць свайму дзіцяці бесклапотнае дзяцінства (а сабе больш-менш спакойнае жыццё), а таму ў шэсць гадоў не аддаюць малечу ў школу. Атрымліваецца, што пры існаванні дэфіцыту месцаў у дашкольных установах шасцігадовае дзіця, якога чакалі ў школе, займае ў садзіку фактычна чужое месца? Пэўная частка педагогаў лічыць, што пакідаць дзіця ў дзіцячым садку да сямі гадоў можна толькі пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў, а калі дзіця і фізічна, і псіхалагічна гатова да навучання ў школе, то трымаць яго ў садзіку абсалютна немэтазгодна. А калі бацькі ўсё ж такі жадаюць гэта рабіць, то няхай цалкам аплачваюць знаходжанне ў садзіку свайго дзіцяці. З іншага боку, некаторыя бацькі, наадварот, жадалі б раней аддаць свае дзіця ў першы клас, але, паводле Кодэкса, зрабіць гэта немагчыма, калі шэсць гадоў дзіцяці споўнілася пасля 30 верасня...

Незадаволены педагогі таксама і адсутнасцю падстаў для адлічэння дзяцей з садкоў: некаторыя бацькі прыводзяць дзіця ў садок усяго некалькі дзён у месяц. Выхавальнікі лічаць, што трэба сфармуляваць уважлівыя прычыны адсутнасці выхаванцаў. І калі дзіця пэўны час адсутнічае па няўважлівых прычынах, то яго месца трэба перадаваць іншай сям'і, якая стаіць у чарзе і мае вострую патрэбу ва ўладкаванні дзіцяці ў садок...

Звярнулі ўвагу педагогі таксама і на праблему падвозу выхаванцаў дашкольных устаноў, асабліва актуальную для сельскай мясцовасці. Па-першае, сядзенні ў школьных аўтобусах не абсталяваны пад немаўлят, а па-другое, бацькі фактычна «здаюць» сваё дзіця даросламу ў аўтобусе, і, такім чынам, аднаму педагогу даводзіцца мець справу ўжо з 7-8 малымі. Дарэчы, у анкеце, якую распрацавалі члены парламенцкай камісіі, ёсць і такія пытанні: «Ці лічыце вы неабходным замацаваць у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі забарону на прыцягненне педагогаў да дзейнасці, якая не прадугледжана службовай інструкцыяй?» і «Ці трэба праводзіць абавязковую гутарку з абітурыентамі педагагічных ВНУ з мэтай вызначэння іх прафесійнай прыдатнасці?»

**У анкеце ёсць і такое пытанне: «Ці лічыце вы неабходным замацаваць у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі забарону на прыцягненне педагогаў да дзейнасці, якая не прадугледжана службовай інструкцыяй?»**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АЎТАМАБІЛЬ НЕ РАСКОША

**Для поўнага шчасця сямейнаму дзіцячаму дому Аксаны Андрэевай і Віктара Салаўёва ў Шклове не хапае сваіх «колаў». Бацькі звярнуліся да ўладаў, каб тыя дапамаглі вырашыць іх надзённую транспартную праблему, і атрымалі цвёрдае абяцанне знайсці для іх сямейны аўтамабіль.**

Жыхарка абласнога цэнтра Аксана Андрэева калісьці была мастачкай. Цяпер яна жыве ў Шклове і з'яўляецца выхавальніцай дзіцячага дома сямейнага тыпу. Яе карціны — ранейшыя — упрыгожваюць новы дом, але свае здольнасці Аксана выяўляе цяпер толькі ў сценгазетах і творчых хатніх заданнях для школьнікаў. Разам з мужам Віктарам маладая жанчына выхоўвае дзевяць дзяцей — дваіх сваіх і яшчэ семярых, якія засталіся без апекі бацькоў.

Новае жыццё пачалося, калі Аксане толькі споўнілася 24 гады. Сын Кірыл заўсёды прасіў сястрычку. Ёй і стала Каця, маленькая дзяўчынка, якую ўзялі ў сям'ю. Аднак потым высветлілася, што ў Каці ў інтэрнаце ёсць сястра і брат. І ўсе яны пасяліліся ў Магілёве, у Аксаны і Віктара.

— Варта толькі пачаць, а потым немагчыма спыніцца, — смяецца жанчына.


Вялікая сям'я ў невялікім аўтамабілі.

Яўгенія Пятроўна, маці Аксаны, таксама з вялікай сям'і. Ёй з малодшай сястрой пасля смерці бацькі давялося пажыць у інтэрнаце.

— Мы часта расказвалі, як нам было цяжка, — гаворыць жанчына. — Аксана прыняла гэта блізка да сэрца. Цяпер у яе шмат дзяцей, а я ёй дапамагаю.

Для таго, каб жыць больш утульна, давялося перасяліцца ў Шклоў. На вуліцы Рыжкаўскай у іх вялікі дом, які стаіць «тварам» да ўзбярэжжа Дняпра — навокал прастор, цішыня, свежае паветра. Дзеці бегаюць па снезе з цацачнымі самалётамі, катаюцца з ледзяных горак.

Шыкоўнае раздолле для малых, але праблемы для бацькоў. Бо за аддаленасць ад аўтамагістралі і, адпаведна, ад крамы і школы даводзіцца расплачвацца транспартнымі клопатамі.

Дзеці павінны ездзіць у садок і школу, а іх бацькі — забяспечваць сям'ю неабходнымі рэчамі, найперш прадуктамі. Дзве булкі хлеба на дзень і тры белыя батоны — штодзённы хлебны мінімум гэтага дзіцячага дома. Плюс свежыя малочныя прадукты. Карацей, дзве кайстры з прадуктовай крамы даводзіцца цягаць кожны дзень. Вялікія закупкі робяцца ў выхадны, з дапамогай старэйшых дзяцей. Тут не трэба забывацца і пра неабходныя наведванні медыцынскіх і іншых устаноў.

— Да ўсяго неабходна даехаць: у Дом культуры на танцавальныя заняткі, у спартыўную секцыю, і нават бліжэйшая крама ў кіламетры ад нас, — пералічвае тата Віктар. — Калі няма аўтамабіля, даводзіцца ісці пешшу і ехаць на аўтобусе.


У самай малодшай, Лірыны, няма ніякіх транспартных праблем.

Так што вялікай сям'і абавязкова патрэбны свае «колы». Тэмп цяперашняга жыцця такі імклівы, што аўтамабіль для дзіцячага дома — гэта дакладна не раскоша, а суровая жыццёвая неабходнасць.

У Аксаны і Віктара раней быў свой аўтамабіль, набыты ў крэдыт. Аднак з ім здарылася бяда — ён загарэўся, а менавіта гэты выпадак не быў прадугледжаны страхоўкай. Кампенсацыі ўладальнікі не атрымалі, і цяпер вымушаны перасоўвацца пешшу. Да прыпынку грамадскага транспарту — каля кіламетра. На жаль, школьны аўтобус не можа праехаць па вузкіх вулачкам прыватнай забудовы. Выручаюць невялікія старыя «жыгулі», якія на час пазычылі спагадлівыя сваякі. На іх даводзіцца рабіць некалькі «ходак», каб усіх давезці і ўсё прывезці, але гэта лепш, чым нічога, асабліва ў холад і снег.

Узяць новы крэдыт на аўтамабіль сям'і не пад сілу, прызнаюцца Аксана і Віктар. Таму яны звярнуліся да кіраўніцтва Шклоўскага раёна і Магілёўскай вобласці. Паводле закону, сямейным дзіцячым дамам трэба прадаставіць жыллё, а вось пра транспарт згадкі няма. Аднак насамрэч без свайго аўтамабіля такім вялікім сем'ям, асабліва ў глыбінцы, не абысціся. Таму на прыёме ў старшыні аблвыканкама Пятра Рудніка Аксане паабяцалі падтрымку.

— Мы звярнуліся па дапамогу да Нацыянальнага банка, — тлумачыць старшыня Шклоўскага райвыканкама Аляксандр Бойка. — Пры замене там аўтапарка, нам аддадуць два аўтамабілі. На сабраныя грошы адрамантуем іх належным чынам і перададзім дзвюм вялікім сем'ям. Мы абмяркоўвалі гэтае пытанне з Надзеяй Андрэеўнай Ермаковай, і яно павінна вырашыцца на працягу месяца альбо двух.

Між тым, жыццё ідзе, і сёння, напрыклад, Кацю нядрэнна было б вазіць на трэніроўкі ў Магілёў: дзяўчынка падае вялікія надзеі ў гімнастыцы і ўражвае гасцей сваёй «гутаперчывасцю».

Ну а шанц стаць добрымі выхавальнікамі ёсць ва ўсіх: цяпер дзеці наперабой носяцца за самай маленькай, Лірынай — дачкой Аксаны і ўсеагульнай любіміцай. Дарэчы, для малой транспартную праблему вырашылі лёгка — набылі цацачны аўтамабіль. Цяпер яе катаюць усе па чарзе.

— Мы — мабільная сям'я! — ганарыцца Аксана. — Калі паехалі ў цырк, то пешшу ішлі на чыгуначную станцыю. Прычым, Воля, у якой праблемы з ножкамі, была з намі. Таксама ездзім у Магілёўскі заасад, на «Лінію Сталіна» і штогод 9 мая на парад у сталіцу. У выхадныя выязджаем у парк, штотыдзень — у басейн, двума рэйсамі. Затое не сумна!

— Мы спадзяёмся на дапамогу ўлад і марым пра мікрааўтобус, бо нас тут шмат, — шчыра сказаў Віктар. — Трэба адзначыць, дарэчы, што такая праблема не толькі ў нас, але і ў многіх іншых дзіцячых дамах сямейнага тыпу, асабліва ў глыбінцы, у сельскай мясцовасці. Без свайго транспарту нам не абысціся.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Шклоўскі раён.*

# БАРАЦЬБА З КАРУПЦЫЯЙ — АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗАДАЧ

**Паводле вынікаў сацыялагічных даследаванняў інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, злачыннасць уваходзіць у дзясятку праблем, што найбольш хвалююць грамадзян. На думку рэспандэнтаў, карупцыя знаходзіцца на 11-м, а алкагалізм на 2-м месцах. Яны нават апярэдзілі праблему росту рэальных даходаў і жыллёвыя пытанні.**

Жыхары Міншчыны (66%) заклапочаны росквітам карупцыі ў беларускім грамадстве, у тым ліку 18% адзначылі, што гэтая з'ява вельмі распаўсюджана, а 8% прызналіся, што самі рабілі неафіцыйныя выплаты адказным асобам. Большасць жыхароў вобласці (77%) негатыўна ставіцца да карупцыі. Тым не менш у пэўнай меры апраўдваюць яе 22% рэспандэнтаў, у тым ліку 18% сцвярджаюць: карупцыя незаконная, але такім чынам ёсць магчымасць вырашыць свае праблемы. Такая інфармацыя была агучана падчас пасяджэння Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, дзе прааналізаваны стан работы па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй за 2012 год.

Як адзначыў начальнік упраўлення ўнутраных спраў аблвыканкама Віктар Сянько, на Міншчыне летась выяўлена 675 злачынстваў эканамічнага характару (без уліку фальшываманецтва). Гэта больш, чым у іншых рэгіёнах краіны, за выключэннем Гомельскай вобласці. У тым ліку — 274 факты карупцыі, з якіх 111 — хабарніцтва. (Для параўнання: у 2011 годзе іх было 90.) Найбольшая колькасць злачынстваў назіраецца ў гандлі — 151, прамысловасці — 100, аграпрамысловым комплексе — 64.

У верасні мінулага года Следчы камітэт распачаў крымінальную справу ў дачыненні да выканаўчага дырэктара сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «ОКСЕСінвест». Фірма была створана чэшскай кампаніяй для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта, які прадугледжваў узвядзенне малапавярховай забудовы непадалёку ад вёскі Лапаровічы Мінскага раёна. Для гэтага было выдзелена 279 гектараў зямлі. Аднак кіраўнік прадпрыемства спрабаваў завалодаць грашовымі сродкамі замежных кампаній пад выглядам «перадачы хабару адказным асобам за заключэнне інвестыцыйнага дагавора». Памер вымагання вымяраецца некалькімі мільёнамі еўра.

У будаўнічай галіне карупцыйная злачыннасць — гэта, як правіла, завышэнне кошту выкананых работ і крадзеж матэрыялаў. Найбольш значныя крымінальныя справы заведзены на кіраўнікоў таварыстваў «Санат-Буд» і «Крэма». Яны ўкралі, адпаведна, 235 і 588 млн рублёў нібыта для набыцця будаўнічых матэрыялаў і выплаты заработнай платы работнікам на ўзвядзенні шматкватэрных жылых дамоў з дзяржаўнай падтрымкай у вёсках Бараўляны і Прылукі Мінскага раёна.

Звыш 22 тон мяса ўкрала кладаўшчыца таварыства з абмежаванай адказнасцю «Трайпл-Велес» па папярэдняй дамоўленасці з вадзіцелямі. Жанчына нанесла ўрон прадпрыемству ў суме 550 млн рублёў. Падчас следства яна прызналася, што недастачу яна кампенсавала б усяго за месяц работы.

Варта дадаць, што ўсяго да крымінальнай адказнасці летась прыцягнуты 223 асобы. Матэрыяльныя страты па закончаных крымінальных справах эканамічнай накіраванасці склалі 5 мільярдаў рублёў, 3 мільярды з якіх кампенсаваны (60%). Акрамя таго, арыштавана маёмасць злачынцаў на суму 4,3 млрд рублёў. У выніку вернутыя сродкі перавышаюць памер нанесеных страт.

Па словах Віктара Сянько, праваахоўныя органы разам з кантралюючымі праводзяць праверкі мэтавага і рацыянальнага выкарыстання дзяржаўных сродкаў юрыдычнымі асобамі, прадпрымальнікамі. У прыватнасці, супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўваходзяць у склад аўкцыённых і тэндарных камісій, а таксама замацаваны за кожнай Дзяржаўнай праграмай, што рэалізуецца на тэрыторыі вобласці. Разам з тым, барацьба з карупцыяй і злачыннасцю недастаткова эфектыўная, адзначыў губернатар Барыс Батура. «Барацьба з карупцыяй заўсёды была і застаецца важнейшай дзяржаўнай задачай. Менавіта карупцыя падрывае асноўныя канстытуцыйныя прынцыпы: сацыяльную справядлівасць і роўнасць усіх перад законам. Прычынай карупцыі з'яўляюцца бюракратызм, безадказнасць і безгаспадарчасць». На яго думку, неабходна выпрацаваць дзейсную сістэму барацьбы з гэтай антысацыяльнай з'явай, прымаць максімальна жорсткія меры і эканамічныя санкцыі да зламыснікаў з абавязковым звальненнем з працы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Эканоміка

# БАЛАНС ІНТАРЭСАЎ

**Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і яе шматгадовы партнёр, замежнае прыватнае прадпрыемства «Брытыш-Амерыкан Табака», рэалізавалі новы інвестыцыйны праект коштам 11 мільёнаў еўра.**

Інвестыцыі былі накіраваны на набыццё дзвюх ліній для вытворчасці цыгарэт фарматаў «Compact King Size» і «Super Slims». Кожная лінія разлічана на выпуск 6 мільёнаў цыгарэт у суткі.

На прэс-канферэнцыі з нагоды ўводу ў эксплуатацыю дзвюх новых вытворчых ліній **генеральны дырэктар Гродзенскай тытунёвай фабрыкі «Нёман» Юрый ЧАРНЫШОЎ** зазначыў, што гэта вынік плённага, узаемавыгаднага супрацоўніцтва з кампаніяй «Брытыш-Амерыкан Табака» ў Беларусі. Новае абсталяванне дазволіць максімальна задаволіць патрэбы ўнутранага і знешняга рынку ў якаснай, запатрабаванай прадукцыі, а таксама забяспечыць значны прырост падатковых плацяжоў у бюджэт.

Узважаная палітыка дзяржавы дапамагае рэалізоўваць праекты па мадэрнізацыі і імпартазамяшчэнні з прыцягненнем замежных інвестыцый, лічыць **дырэктар замежнага прыватнага прадпрыемства «Брытыш-Амерыкан Табака Трэйдынг Компані» Павел БАЧАРОЎ**:

— Прымаючы рашэнне аб інвесціраванні ў гэтыя лініі, мы ведалі, што адбываецца лібералізацыя цэнаўтварэння ў тытунёвай індустрыі. Падтрымліваем гэта, а таксама ўвядзенне такога паняцця, як «максімальна рынкавая цана». Мінулы год паказаў, што ніякіх сюрпрызаў не адбылося, рынак на гэта адрэагаваў нармальна. Гэта было правільнае рашэнне, якое дазваляе індустрыі ўстойліва развівацца.

Супрацоўніцтва кампаніі «Брытыш-Амерыкан Табака» з Гродзенскай тытунёвай фабрыкай «Нёман» і надалей будзе развівацца на прынцыпах дзяржаўна-прыватнага партнёрства, балансу інтарэсаў дзяржавы і бізнэсу.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# ЖАНЧЫНАМ АДВАГІ НЕ ЗАЙМАЦЬ

**Жыхаркі горада Віцебска Таццяна і Любоў Багданавы былі адзначаны кіраўніцтвам Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама за праяўленую мужнасць пры затрыманні злачынцаў.**

— Знаходзячыся ў памяшканні кафетэрыя на праспекце Чарняхоўскага ў абласным цэнтры, гэтыя жанчыны сталі сведкамі таго, як двое п'яных грамадзян наўмысна збілі мужчыну і завалодалі яго маёмасцю, — паведамілі ў вышэйназваным упраўленні. — Не застаўшыся ў баку ад чалавечага гора, гэтыя жанчыны не пабаяліся заступіцца за пацярпелага і запатрабавалі ад хуліганаў не біць чалавека. Аднак іх ніхто не слухаў. Дэбашыры забралі нарабаванае і паспрабавалі схавацца. Але далёка адысці так і не змаглі. На іх шляху апынуліся Таццяна і Любоў Багданавы. Яны перагарадзілі злачынцам дарогу, уступілі з імі ў проціборства, затрымалі і перадалі супрацоўнікам міліцыі, якія прыбылі на месца ўчынення злачынства. Гераіні былі адзначаны ў намінацыі «За неабыякавасць».

А пераможцам у намінацыі «Адважнае сэрца» стаў Ігар Махонь, навучэнец Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага ліцэя № 1. Ігар, праходзячы позна ўвечары па адной з вуліц абласнога цэнтра, пачуў крыкі аб дапамозе. Не разважаючы, хлопец паспяшаўся на дапамогу. Падбегшы бліжэй, Ігар убачыў, як зламыснік спрабуе распрануць жанчыну. Убачыўшы хлопца, ён спалохаўся, і паспяшаўся збегчы з месца злачынства. Паведаміўшы пра гэта ў міліцыю, ліцэіст кінуўся яго пераследаваць. Перадаўшы звесткі аб месцазнаходжанні злачынцы, Ігар сачыў за ім аж да затрымання апошняга супрацоўнікамі міліцыі.



Таццяна і Любоў Багданавы (на фота справа) сярод пераможцаў акцыі «Грамадзянская мужнасць».

У намінацыі «За смеласць і рашучасць» перамог жыхар горада Наваполацка Мікалай Саўчанка. Ён затрымаў грамадзяніна, які выкраў тавары з крамы. Падчас затрымання злачынец аказаў супраціўленне і прычыніў яму цялесныя пашкоджанні. Пакуль доўжылася сутычка, прадаўцы крамы выклікалі міліцыю, і злачынец быў затрыманы.

Пяты год запар ва УУС Віцебскага аблвыканкама падводзяць вынікі акцыі «Грамадзянская мужнасць», разам з гарадской газетай «Віцьбічы» і тэлекампаніяй «Скіф». Толькі летась каля 50 чалавек аказалі дапамогу праваахоўным органам у раскрыцці крымінальных злачынстваў. Усе яны былі адзначаны кіраўніцтвам органаў унутраных спраў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# САМІ СЯБЕ ПАКАРАЛІ

## Хочаце прадаць аўтамабіль? Не парушайце законы

**Прымаючы рашэнне аб продажы аўтамабіля або яго набыцці, варта ведаць, што беларускім заканадаўствам прадугледжаны пэўны парадак заключэння дагавораў куплі-продажу механічных транспартных сродкаў паміж грамадзянамі. Непрыемныя наступствы не абышлі бокам жыхароў гарадскога пасёлка Ушачы, якія вырашылі адступіць ад літары закона.**

Каб прадаць свой «Пежо», адзін перадаў другому ключы ад гэтай машыны, атрымаўшы ад пакупніка частку грошай — 2,6 тысячы долараў ЗША. Астатнюю частку грошай — 5 260 долараў — пакупнік абавязаўся выплаціць на працягу прыкладна 10 месяцаў. І напісаў прадаўцу распіску. Аднак у прызначаны тэрмін прадавец астатніх грошай так і не ўбачыў і звярнуўся ў суд з патрабаваннем абавязаць пакупніка аўто выплаціць астатнюю суму за набыты аўтамабіль.

— Суд Ушацкага раёна, задавальняючы патрабаванні істца і спаганяючы з адказчыка суму доўгу, эквівалентную 5260 доларам ЗША, спаслаўся на выкананне прадаўцом і невыкананне пакупніком прынятых на сябе абавязацельстваў па заключаным паміж імі дагаворы куплі-продажу аўтамабіля. Але пракурорам Ушацкага раёна быў прынесены касацыйны пратэст, паколькі суд не ўлічыў адпаведныя палажэнні Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (аб прызнанні здзелкі, учыненай без выканання патрабавання аб яе дзяржаўнай рэгістрацыі, несапраўднай). Такая здзелка прызнаецца юрыдычна нязначнай, а кожны з бакоў абавязаны вярнуць другому ўсё атрыманае па здзелцы, — тлумачыць нюансы заканадаўства Дар'я Буцэнка, пракурор аддзела Віцебскай абласной пракуратуры. — У судзе прадавец і пакупнік не адмаўлялі, што дагавор куплі-продажу аўтамабіля яны не афармлялі, у ДАІ не рэгістравалі. Пры гэтым пакупнік растлумачыў, што аўтамабіль быў яму перададзены ў тэхнічна няспраўным стане, а на такіх умовах заключаць здзелку ён адмаўляецца.

Пастановай судовай калегіі па грамадзянскіх справах Віцебскага абласнога суда рашэнне суда Ушацкага раёна адменена, па справе вынесена новае рашэнне. У адпаведнасці з апошнім, дагавор куплі-продажу аўтамабіля прызнаны нязначным. Суд абавязаў адказчыка вярнуць прадаўцу аўтамабіль, а з прадаўца на карысць пакупніка спагнаць выплачаную ў мэтах выканання дагавора суму — 2,6 тысячы долараў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




# Снежны суботнік

**Сёння ў Віцебску пройдзе «спецыялізаваны» суботнік па прыбіранні снегу.**

У віцебскім гарвыканкаме заклікаюць гараджан узяць актыўны ўдзел у мерапрыемстве, дапамагчы дворнікам ачысціць ад снегу тэрыторыі ля жылых дамоў. Усім неабходным інструментам для работы гатовы забяспечыць камунальныя структуры, якія абслугоўваюць жылы фонд.

Як паведаміў **Уладзімір ШЛОМА, намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама,** які ўзначальвае гарадскі штаб па падрыхтоўцы і правядзенні суботніка «За чысты горад!», адразу пасля цыклону «Хаўер» у Віцебску прымаліся неабходныя захады па барацьбе з наступствамі стыхіі.

Па звестках сіноптыкаў, вышыня снежнага покрыва на асобных участках перавышае 40 сантыметраў. Таму, нягледзячы на ўсе намаганні камунальнікаў і дарожнікаў, гарадская ўлада разлічвае на дапамогу з боку гараджан у прыбіранні снегу, ад якога не паспелі ачысціць праезныя часткі, тратуары, пешаходныя пераходы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Цана пытання

# КАБАЛЬНЫ ДАГАВОР... ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

## Як кіраўнікі «кідаюць» свае прадпрыемствы

**Факты, пра якія паведаміў «Звяздзе» старшыня гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Валерый КАСЦЮКЕВІЧ, не проста здзіўляюць — шакіруюць. Няўжо кіраўнік можа заключыць дагавор, які прадугледжвае заведама нявыгадныя, нават кабальныя ўмовы для яго прадпрыемства? Аказваецца, падобныя «фокусы» зусім не адзінкавыя, а апошнім часам вельмі распаўсюджаныя. У выніку — каласальныя фінансавыя страты. Прычым гэта адбываецца ў аграрным сектары, суб'екты якога карыстаюцца вялікай дзяржаўнай падтрымкай і часта скардзяцца на безграшоўе і даўгі.**

### «Залатая» агароджа

— Кіраўнікі шэрагу сельгаспрадпрыемстваў падпісваюць з пастаўшчыкамі той ці іншай прадукцыі дагаворы на ўмовах завышаных штрафных санкцый — гэта пеня і працэнты за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі. У выніку такой «дзейнасці» летась па вобласці пастаўшчыкі (а гэта, як правіла, камерцыйныя структуры) спагналі 26 мільярдаў рублёў штрафных санкцый. Гэта грошы, якія былі страчаны для сельгаспрадпрыемстваў, а таксама для бюджэту, які аказвае значную дзяржаўную падтрымку аграрнаму комплексу, — зазначае Валерый Касцюкевіч.

Пастановай Нацбанка Беларусі вызначана стаўка рэфінансавання, якой і павінны карыстацца суб'екты гаспадарання пры заключэнні дагавораў. На сённяшні дзень гэта 30 працэнтаў гадавых. Аднак сёння падпісваюцца дагаворы, дзе працэнты за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі ў 10, а то і ў 20 разоў перавышаюць афіцыйную стаўку. Атрымліваецца ўжо не 30, а 300 ці нават 600 працэнтаў гадавых! І з гэтага разліку плацяцца штрафныя санкцыі. У такіх умовах нават нязначная пратэрміноўка з аплатай асноўнага доўгу прыводзіць да спагнання санкцый, што ў некалькі разоў перавышаюць саму запазычанасць. У выніку кошт тавару для прадпрыемства ўзрастае ў 3, 4, 5, а ёсць факты — і ў 8 разоў.

Напрыклад, саўгас «Поразаўскі» Свіслацкага раёна заключыў з камерцыйнай структурай дагавор на ўстаноўку агароджы. Цана пытання — 18 мільёнаў рублёў. Але на справе дагаворам была прадугледжана вялізная пеня за пратэрміноўку плацяжу, а працэнты за карыстанне чужымі грашыма ў 20 разоў перавышалі стаўку рэфінансавання Нацбанка. У выніку штрафныя санкцыі склалі 70 мільёнаў рублёў — гэта ў 4 разы больш за асноўны доўг. Сапраўды «залатой» атрымалася агароджа...

Альбо вось як у СВК «Орля» Шчучынскага раёна «супрацоўнічалі» з індывідуальным прадпрымальнікам. Прадугледжвалася аказанне паслуг па рамонце і абслугоўванні тэхнікі на 11,4 мільёна рублёў, аднак дагавор падпісалі на такіх умовах пені і працэнтаў за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі, што пратэрміноўка плацяжоў каштавала калгасу амаль 59 мільёнаў рублёў.

Нешта падобнае здарылася і ў Слонімскім раёне. Жыровіцкая сортавыпрабавальная станцыя дамовілася з індывідуальным прадпрымальнікам, што ён выканае работ на 1 мільён 250 тысяч рублёў. Здавалася б, дробязь. Тым не менш своечасова станцыя не разлічылася, а дагавор такі, што штрафныя санкцыі складаюць 11,2 мільёна рублёў — у 9 разоў больш за асноўную запазычанасць. Акрамя таго, з даўжніка спаганяюць 1 мільён рублёў расходаў ІП па аплаце юрыдычных паслуг і дзяржпошліны пры звароце ў суд.

Дарэчы, пасля звароту пастаўшчыкоў тавараў у суд кіраўнікі некаторых гаспадарак асабліва і не перажываюць за інтарэсы сваіх прадпрыемстваў, калі гэтыя інтарэсы ў беражлівым, эфектыўным расходаванні фінансавых сродкаў. Што, як падкрэсліваецца ў прэзідэнцкай Дырэктыве № 3, з'яўляецца галоўным фактарам эканамічнай бяспекі дзяржавы. Напрыклад, СВК «Міжэвічы» Слонімскага раёна заключыў з мінскай фірмай дагавор пастаўкі трубы на 47 мільёнаў рублёў. Прычым гэты дагавор, зноў жа, склалі так, што пасля іску ў суд аб спагнанні асноўнага доўгу і санкцый затраты гаспадаркі павялічыліся да 102 мільёнаў рублёў. Пры гэтым адказчык не прадаставіў водгук на іск, не хадайнічаў аб зніжэнні памеру штрафных санкцый, адкрыцці прымірэнчай працэдуры, не накіраваў свайго прадстаўніка ў судовае пасяджэнне. Цікава, чым жа тлумачыцца такая абыякавасць?

### Пралік ці... асабістая выгада?

Валерый Касцюкевіч звяртае ўвагу на пасіўную пазіцыю многіх кіраўнікоў пры заключэнні дагавароў:

— Падпісаў дагавор няправільна, але ж гэта не значыць, што ўжо нічога нельга зрабіць. Накіруй прапановы свайму контрагенту, які пастаўляе табе тавар. Маўляў, я памыліўся пры падпісанні дагавора, давай унясём змяненні! Не пагаджаецца партнёр па здзелцы — ідзі ў суд. Ёсць такая форма судовай абароны, як разгляд заявы аб змяненнях у дагавор. Суд ацэніць гэты дагавор і сваім рашэннем прывядзе яго ў адпаведнасць з законам. А што тычыцца пені, то яе ўплата заканадаўствам увогуле не прадугледжана, гэта чыста дагаварная адказнасць, якую можна наогул выключыць. І тут не трэба быць вялікім юрыстам. Трэба проста чытаць праект дагавора, і калі нешта не падабаецца, пісаць у пратаколе рознагалоссяў аб выключэнні альбо змяненні тых ці іншых пунктаў.

**— Але чаму ж гэта не робіцца? Не стаіць жа пастаўшчык тавару ці выканаўца паслуг з дубінкай каля кіраўніка прадпрыемства, прымушаючы яго да заключэння здзелкі на заведама нявыгадных для гэтага прадпрыемства ўмовах.**

— З гэтай праблемай мы сутыкаемся не першы год, але яна набывае ўсё большы маштаб, становіцца ўжо нейкай сістэмай. І гэта, наколькі я ведаю, датычыцца аграрнага сектара не толькі Гродзеншчыны, а ўсёй краіны. Прычым вышэйзгаданая лічба — 26 мільярдаў штрафных санкцый — гэта толькі, так бы мовіць, вяршыня айсберга. Па-першае, калі б суд не змяншаў гэтыя санкцыі, то было бы не 26, а, можа, 100 мільярдаў рублёў. А па-другое, мы бачым толькі тое, з чым звярнуліся ў суд. Насамрэч здзелак, пры якіх кіраўнікі падпісваюць нявыгадныя для сваіх прадпрыемстваў дагаворы, разоў у пяць больш. Я не следчы, не пракурор. Але, на мой погляд, тут ёсць нейкі намер. Верагодна, што мільёны рублёў, якія страчвае прадпрыемства, перапампоўваюцца камерцыйным структурам, абнаяўліваюцца і дзеляцца канкрэтнымі асобамі.

**— Якія ж захады робяць мясцовыя ўлады?**

— Летась Гродзенскі аблвыканкам даў адпаведныя даручэнні, каб усе гэтыя дагаворы, што заключаюцца сельгаспрадпрыемствамі, дзе няма юрысконсультаў, правяраліся на адпаведнасць заканадаўству і візіраваліся ў раённых упраўленнях па сельскай гаспадарцы і харчаванні. Акрамя таго, гаспадарчы суд Гродзенскай вобласці ў мінулым годзе і ўжо сёлета накіраваў больш за 80 адпаведных паведамленняў на прадпрыемствы і ў райвыканкамы. Адказы атрымліваем, але не бачым ніякіх радыкальных захадаў, ніхто пальцам не паварухнуў. Няўжо гэтыя санкцыі, што прад'яўляюцца прадпрыемствам, іх кіраўнікоў задавальняюць?

А тым часам да Валерыя Касцюкевіча тэлефануе галоўны бухгалтар сельгаспрадпрыемства: «Дапамажыце выплаціць зарплату!». Цяпер судовы выканаўца прад'яўляе ў банк плацежнае патрабаванне аб бясспрэчным спісанні грошай з рахунка гэтага СВК па іску, які звязаны з невыкананнем дагавора. Чаму падпісалі гэты кабальны дагавор? Галоўны бухгалтар адказвае, што, кіраўнік прадпрыемства сам такія дагаворы падпісвае, а яна іх не бачыць. Але чаму ж тады не кіраўнік клапоціцца пра зарплату работнікаў? Можа, калі ён падпісаў заведама нявыгадны для свайго прадпрыемства дагавор, дык няхай здымае з асабістага рахунка грошы і плаціць сваім работнікам?

Валерый Касцюкевіч паведаміў, што цяпер да гэтай праблемы падключыліся праваахоўныя органы, неўзабаве яна будзе разгледжана на пасяджэнні Гродзенскага аблвыканкама...

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Камандзіроўка па пісьму

# АЛЬШАНСКІ СТРОЙ З КУФЭРКА БАБЫ ГАННЫ

**Альшаны Столінскага раёна ўсе ведаюць як край агуркоў. Тутэйшыя работнікі культуры жартуюць: «У Альшанах пра што ні пачні гаварыць, усё скончыцца адной тэмай: у каго які парнік і хто колькі агуркоў вырасціў». Бо і ў мясцовага настаўніка ёсць цяпліца, у доктара таксама ладны парнічок, ну і культработніку з яго зарплатай без агурочнай падтрымкі — нікуды. Тым больш нечакана было атрымаць пісьмо з Альшан зусім на іншую тэму.**


Ганна Каляда.

Вось вытрымкі з ліста Ганны Васільеўны Каляды: *«Мне ўжо мінула 84 гады. Усё сваё жыццё працу па гаспадарцы і на зямлі я сумяшчала са сваёй любімай справай: ткацтвам, шыццём, вышываннем. Нават цяпер не пакідаю гэты занятак. Такой я нарадзілася. Не магу сядзець без работы. Але ўсё часцей задумваюся над тым, каму застанецца мой «скарб», які я з такой любоўю збірала ўсё жыццё. Не хацелася б, каб мае рэчы загінулі ці трапілі ў рукі людзей, якія ў гэтым нічога не цямяць. У мяне ёсць цікавыя мясцовыя строі — кашулі, фартухі, спадніцы розных часоў, вясельныя ручнікі, ручнікі на абразы. Ёсць і прадметы ткацтва: вялікія кавалкі палатна. Дапамажыце мне рэалізаваць гэтыя рэчы праз музеі, праз прыватных асоб, якія ведаюць у іх толк!»*

Вось такая нечаканая просьба змяшчалася ў пісьме. У дом да Ганны Васільеўны мы заехалі разам з дырэктарам мясцовага Дома культуры Тамарай Скрабейка, супрацоўнікамі раённага аддзела Сцяпанам Кудраўцом і Аленай Дубойскай. Гаспадыня выклала свае фартушкі-ручнікі на канапу і сама не стамлялася любавацца імі. Яна расказвала, як вышывала іх вечарамі, а то і начамі пасля доўгіх працоўных дзён: «Нараблюся за дзень, намерзнуся, бульбу перабіраючы, здаецца, ног не чую, а як сяду за вышыўку — душа радуецца, цела адпачывае».

Ручнікоў вышываных у бабулі Ганны не злічыць. Кожны абраз, кожны партрэт, якімі ў яе завешаны ўсе сцены, аздоблены ручніком. Узоры амаль не паўтараюцца. Але самае цікавае, што вышывае яна і зараз. Вясельныя ручнікі, ручнікі з кветкамі, арнаментамі зусім нядаўна выйшлі з-пад іголкі майстрыхі. Шые Ганна Васільеўна таксама мяшэчкі для агурочнай расады. Гэта ўжо чыста альшанскі бізнэс. У справу ідзе выкарыстаная поліэтыленавая плёнка. З яе робіцца пакецік памерам прыкладна 10 на 15 сантыметраў і зашываецца дробным радком. У гэты мяшэчак змяшчаецца глеба і высаджваецца адзін агурок. 100 такіх пакетаў каштуе 7 тысяч рублёў. Іх звычайна бяруць тысячамі штук. Застаецца здзіўляцца, які роўны радок шва выходзіць з-пад машынкі амаль што 85-гадовай майстрыхі. «А што мне цяпер рабіць? — разважае гаспадыня. — Спаць доўга не люблю».

А вось альшанскі строй давялося бачыць упершыню. Гэтае адзенне прынцыпова адрозніваецца, скажам, ад маларыцкага касцюма, ад драгічынскага, брэндам якога стаў бездзежскі фартушок. «Фішкай» альшанскай прыгажуні, галоўным элементам адзення была спадніца (тут гавораць «шподныця»), якая шылася з ручной плісіроўкай, аздаблялася карункамі і вышыўкай. А «двойкі» ўтваралі «кофты» і фартухі з аднолькавым арнаментам. Цікава, што пашыты ўсе строі з крамнай тканіны. Шыць прыгожа, па-майстэрску ўмела не кожная гаспадыня, расказвала Ганна Васільеўна, некалькі швачак на вёску было, у іх усе і замаўлялі. А ўжо сярод вышывальшчыц вылучалася і Ганна Каляда.

Зараз Ганна Васільеўна спявае ў царкоўным хоры. І вельмі засмучаецца тым, што цяпер у царкву «даўнейшае» ніхто не надзявае: «Здаецца, каб апранула гэта на сябе, то падрасла б, паздаравела б». Але ніхто так не ходзіць, вось і яна не адважваецца. Затое па нашай просьбе з задавальненнем надзела зялёны строй і дэманстравала адзін за адным рознакаляровыя фартушкі.

Пакуль нястомная гаспадыня паказвала свае строі, расказала, што жыве адна. Мужа няма ўжо 15 гадоў. Дзве дачкі аселі ў ваколіцах Брэста, сын — у Альшанах. Бабуля і цяпер дапамагае ўнукам... А вось выканаць яе просьбу аказалася зусім не проста. Дырэктар Столінскага краязнаўчага музея Святлана Вярэніч сказала ў тэлефоннай размове, што супрацоўнікі музея абавязкова наведаюць Ганну Васільеўну. Нягледзячы на тое, што ў экспазіцыі музея ёсць альшанскі строй, калі работнікі заўважаць нейкі іншы акцэнт альбо арнамент у тым, што зрабіла Ганна Васільеўна, то пастараюцца набыць адзін-два ўзоры. Выказала рашучасць пабываць у Альшанах і дырэктар музея «Бездзежскі фартушок» з Драгічынскага раёна Марыя Астаповіч. Але ж музейныя работнікі звярнулі ўвагу на адзін важны момант. Музеі маюць невялікія сродкі, апошнім часам такія рэчы, як фартухі, яны набывалі ў вясковых жыхароў па 50-80 тысяч рублёў. Некаторыя гаспадыні наогул аддаюць строі ў дар — проста каб рэч не прапала, а знаходзілася ў музеі, радавала вока наведніка. У Ганны Васільеўны, як мы пераканаліся, свой погляд на кошт гэтых рэчаў. І тут ужо двум бакам застанецца дамаўляцца...

Як заўважыла дырэктар дома культуры Тамара Скрабейка, у многіх старэйшых альшанскіх жанчын ёсць куфэркі з дзявочымі строямі, а то і пашытымі іх матулямі-бабулямі. Цудоўную калекцыю Тамары Станіславаўны нядаўна паказала Сцефаніда Лук'янаўна Красько. Раней такія рэчы многія гады захоўваліся ў сям'і, перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Цяпер шмат што змянілася, рынкавыя адносіны зачапілі і сямейныя рэліквіі. Як абыходзіцца з гэтымі рэліквіямі, кожны вырашае сам...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Столінскі раён*

■ Простая мова

# ГЭТА — СНЕЖАНЬ...

**Як там у песні? Перафразуючы — «Такого снегопада, такого снегопада во век не знали здешние места...». І сапраўды — завея, замець... Адно слова — цыклон! Назаўтра, калі ён сышоў, толькі і размоў было, што на тэму «дзе, хто і колькі» — гадзін прастаяў (на прыпынках ды ў заторах), вёрст прайшоў, аварый пабачыў... І што перажыў:**

**— Раніцай з пад'езда выйшаў, — расказвае прыяцель, — машыны няма... Скралі?! Прыгледзеўся — не, дзякуй Богу: краёк бакавога люстэрка з гурбы тырчыць.**

**...Гаспадару — сам жа машыну ставіў — той краёк разгледзець лягчэй было. Трактарыстам цяжка: адзін, казалі, расчышчаючы вуліцу, на падобную «гурбу» пару «коўшыкаў» снегу насыпаў — пацвердзіў крылатае: на каго Бог, на таго і людзі.**

## ЁСЦЬ ПОРАХ!

Горад, дзень, вірлівы праспект. З яго (насустрач) — знаёмая постаць: сусед... Надоечы бачыліся, размаўлялі, так што цяпер, кіўнуўшы, можна размінуцца, але... На плячы ў яго — штосьці белае... Спыняю... Здымаю з пухавіка пёрка, пытаю:

— Што — сыплецца?

— Дык пух жа не пясок, — усміхаецца той, пацвярджаючы мудрае: можна пры сустрэчы абмяняцца вітаннямі. Але лепей — усмешкамі.

## НЕ ПРА БОТЫ

Дзве жанчынкі — дзве сястры, адной маці дочкі. Ба́цькі ў іх, праўда, розныя. Як і ўзрост: старэйшая — яшчэ даваенная, малодшая — ужо пасля...

Днямі ў госці зайшлі.

— Як вам мая абноўка? — спытала маладзейшая, выцягнуўшы нагу і пакруціўшы наском прыгожага бота. — Надоечы па зніжках купіла.

— Мне таксама трэба было б, — цяжка ўздыхнула старэйшая. — Але ж гэту зіму ў старых дахаджу, а да новай — уга... Можа, ці дажыву яшчэ... І што тады? Дачка ж мае боты насіць не будзе, нявестка — таксама. Яшчэ выкінуць — новыя.

...Дзве жанчынкі, дзве сястры — родныя і розныя.

## УМЕЛА ЎЗЯЦЬ...

Чуткам пра тое, што сын яе ў горадзе гуляе «з нейкай бабай і дзецьмі», маці не верыла. Бо не хацела: не дурны ж ён, не стары, не брыдкі, не калека, не зломак... Пакліча — сем дзевак прыбяжыць.

Аднак дзеўкі яго чамусьці не вабілі — да ўдавы прыкіпеў!

«Счаравала, — шумела вёска, — нечым апаіла, далібог!.. Да варажбітак едзь, — раілі матулі. — Вокны ёй пахвашчы... Прасіся... Забарані!»

Маці (сама ўдава) усё слухала, усё перажывала, але сына маліла аб адным: «Думай»...

Мусіць, запозна гэта было? Мусіць, ён усё ўжо вырашыў? Ажаніўся, удачарыў яе дзяцей, роднае праз год дабавіў...

Бабуля не дзяліла іх (што ўжо тут дзяліць?): чым магла дапамагала.

Выраслі — азірнуцца не паспела. А сама — паслабела.

На зіму сын у горад забраў, да сябе. Акрыяла там — хоць партрэты пішы: шчочкі ружовыя, апраткі чысцюткія... І паправілася крыху. «Ведама, — усміхаецца, — добрае ўжываю, нічога не раблю...»

І праз паўзу, з гонарам: «...Нявестка не дае — усё сама ды сама... Яшчэ і падлогі кожны вечар памые. Я ёй — пасядзі, нахалеру? А яна — каб паветра свяжэйшае было. Вы ж да свежага дома прывыклі?»

...Беларуская прымаўка: «Пазычай — як умееш, аддавай — хораша».

## АДНА ПЧАЛА МЁДУ НЕ НАНОСІЦЬ

Самае складанае мастацтва — быць на зямлі чалавекам. Не так важна, кім пры гэтым працуючы. Пракопавіч вось — дворнікам: прыбірае ў доме пад'езды, чысціць тратуары — акуратна, сумленна, з павагай да жыльцоў...

Што, дарэчы, узаемна! Бо снег пасля тога цыклону поруч з ім раскідвалі з дзясятак мужчын. Казалі:

— У нас — сапраўдны суботнік.

Дзед папраўляў:

— Талака!

## ПОШУКІ СЛОЎ

Здалёк...

Сінонім — паводле анекдота — гэта слова, якое мы ўжываем, калі не ведаем, як напісаць патрэбнае. *Нямала*, напрыклад, гэта *шмат*, гэта *процьма, гіблота, хмара, лавіна,* гэта *да халеры*, *мільён*, ці *без ліку, па вушы, па горла, як сабак, хоць вазамі вазі* і г.д.

У слове вёска памылкі, відаць, не зробіш. А, між тым, сінонімы ёсць, бо яе, невялічкую, можна назваць засценкам, вялікую — ужо сялом, яшчэ большую і з прыкметамі горада (места) — гарадскім пасёлкам, мястэчкам...

З хат яны... А яшчэ — з катэджаў (паводле слоўніка — невялікіх жылых дамоў у прыгарадзе), з асабнякоў (дамоў багатых уласнікаў), з маёнткаў — панскіх сядзіб (яны да нас, здаецца, вяртаюцца?), часам — нават з палацаў (вялікіх, раскошных, багатых будынкаў)...

Апошнія, вядома ж, ужо з «наваротамі», гэта значыць, з летнімі садамі, з гаражамі, з лазнямі, само сабой — з усімі выгодамі. Што ўжо казаць пра ванныя?!

Дык вось, пакойчыкі гэтыя калегі па пяру ўсё часцей называюць — лазенькамі. Недакладна, як падавалася. Бо лазня ўсё ж ад слова лазіць — на палок. Тут жа...

Зрэшты, тут — гарачая вада, тут цёпла, тут, паводле слоўніка, спецыяльнае памяшканне, дзе мыюцца. Тут, урэшце, таксама можна залезці — у ванну. Дык чаму б не лазенька?

Тым больш — калі гэтак гучыць?

## БЕЗ АДКАЗУ

Коратка гэту гісторыю распавесці цяжка, але...

Адна з нашых жанчын запрасіла да сябе італьянца (дарэчы, прафесара). Той прыляцеў — на тры дні. І, на жаль, адразу ж меў непрыемнасці. Першая: у аэрапорце яго затрымалі, каб высветліць, ці не на продаж вязе тры пакуначкі сыру. Другая — і там жа, у аэрапорце — дзяўчына, якая разумела хіба па-руску, выпісала яму страхоўку на два дні (замест трох), чаго ён не заўважыў... Трэці «сюрпрыз» атрымаў назаўтра, калі з «прымаючым бокам» паўдня прастаяў у чарзе на рэгістрацыю — прычым... марна, бо як высветлілася, за яе трэба было папярэдне, у банку, заплаціць пошліну...

Але і на гэтым прыгоды італьянца не скончыліся: на паслязаўтра зноў была доўгая і... марная (з-за памылкі са страхоўкай) чарга на рэгістрацыю — давялося наведаць дзяржстрах. І толькі ў дзень адлёту...

Гэтая гісторыя міжволі нагадала іншую, на першы погляд — нічым не падобную.

Знаёмец на службовай машыне суправаджаў замежную фуру з каштоўным грузам. Кіроўца яе (на нашай тэрыторыі) сказаў (справа жыццёвая), што добра б спыніцца — ля «маленькага дамка» па вялікай патрэбе.

Што прасцей, як здавалася, бо тыя дамкі ля дарогі ёсць! Але ж замежнік аказаўся з форсам: не падабаліся яму — ні цёплая прыбіральня з брудным унітазам, ні халодная ў лесе, без унітаза ўвогуле.

У надзеі на нешта лепшае яны ехалі далей...

А спыніліся ў чыстым полі, раптам. Кіроўца той куляй выскачыў з кабіны — хацеў адбегчыся крыху, але дзе там — снег па калені...

Што, магчыма, важна, абодва памянёныя госці ў краіне былі ўпершыню. Пытанне: чым іх трэба было карміць і паіць, што паказваць і расказваць, як забаўляць, каб згладзіць першае ўражанне, каб зацікавіць іх прыехаць яшчэ?

## КАБ НЕ ЧУЦЬ

...Тэлевізараў (дакладней — плазменных экранаў) у грамадскім транспарце іншых краін яшчэ не бачылі.

Зрэшты, не так шмат дзе былі, не ўчора прыехалі ды і перамяшчаліся там пераважна пехам.

Іншая справа тут, у Мінску: ездзіць даводзіцца шмат! «Тэлевізар» глядзець — таксама.

Што паказваюць? Усё тую ж рэкламу — вокнаў, швабраў, нажоў, станікаў, нейкіх курсаў, магаз**и**на «Кал**и** ласка» (менавіта так!)...

І гэта шчасце, калі ехаць трэба хвілін 10-15. А калі з гадзіну? І дзень пры дні...

Хоць-нехаць пазайздросціш тым, хто, не могучы выключыць «тэлевізар» (бо гэта ж не дома), «выключае»... сябе: затыкае вушы навушнікамі і заплюшчвае вочы. Каб б не чуць. Каб не бачыць.

Яшчэ і ў дарозе.

## У ГАСЦЯХ ЯК ДОМА?

Горад. Метро. У вагонах — доўгія лаўкі... Але ж спрэс занятыя.

На адной — чародка замежнікаў, мусіць, студэнтаў: сядзяць, гамоняць пра штось.

А побач — бабулька... Не іначай з рынка, бо з цяжкою сумкай і змарыўшыся...

Моўчкі стаіць.

Красамоўнае: «Панаехалі тут...» у яе на твары напісана.

## РАДНЯ... ДА ПАЎДНЯ

Бацька гэтай жанчыны і доўга жыў, і добра памёр: у лузе, з граблямі ў руках, на 98-м годзе жыцця.

Дачцэ яго цяпер меней, але ж, мусіць, па бацьку пайшла — рухавая, бадзёрая, а ўжо памяць...

У лютым, праўда, за тэлефон заплаціць забылася. Сказала (першы раз, на 91-м годзе жыцця!): «Напэўна, гэта старасць».

І пра смерць пачала гаварыць. Маўляў, ні дзяцей у мяне, ні ўнукаў. Хто пахавае?

Суседка суцешыла. І якія ж словы знайшла! Сказала: «Ты памерці не паспееш, як радня прыбяжыць!».

...Мела рацыю, бо гэта — ці не прыкмета часу: як даглядаць чыюсьці старасць, дык ахвотных вобмаль, як спадчыну прыняць — цэлая чарга.

## І СМАЧНА ЕСЦІ!

...Гасцінец перадалі: невялічкі пакунак з шакаладам, пакуль — нябачаным. Значыць, трэба пакруціць у руках. Назва на ўпакоўцы... Ніжэй — прыпіска (драбяза, як той казаў, але ж прыемная): «12 пасланняў для цябе»...

Яно ж цікава, якіх?

Пад першай цукерчынай, на абгортцы, надпіс: «Пустое хваляванне ні ў чым не дапаможа. Адпусці сітуацыю — убачыш, усё вырашыцца», пад другой — «Можа, лепей узяць паўзу і ўсё абдумаць?», пад трэцяй — «Навошта чакаць, калі можна зрабіць першы крок?»

Смачныя цукеркі! Еў бы і еў! Досыць слушныя парады — чытаў бы і чытаў! Бо цікава ж, якія там яшчэ — у гэтым пакуначку. А ў іншым — будзе 12 іншых? Ці тых самых?

На што толькі не ідзе разумны вытворца, чаго не прыдумае, каб «скарміць» нам сваю прадукцыю!

## ГЭТА — СНЕЖАНЬ...

— Пасажыры, аплачваем праезд! — нясецца з хваста аўтобуса: высокая, «шырокая» (асабліва ў клубах) кандуктарка «плыве» па пустым праходзе, час ад часу спыняецца, каб, што называецца, «павісець над душой»: «Што ў вас?»

— Праязны, — кажу, што дакладна ведаю.

— Прад'яўляйце! — загадвае жанчына.

Гэта лёгка: дастаю кашалёк, адтуль праязны — першы, што трапіў пад руку, за... снежань.

— Дзякуй, — здавальняецца жанчына.

Можа, не ведае, што снежань — гэта зусім не сакавік? А можа, наадварот — болей верыць не таму, што напісана на маленькай казённай паперцы, а таму, што бачыць за вокнамі: там... снежань.

**Валянціна ДОЎНАР**

**Ад рэдакцыі.** Кніга мініяцюр журналісткі «Звязды» Валянціны Доўнар «Каб сказаць... І пачулі» прадаецца пакуль у кнігарнях. Пытайцеся.

■ Песню бярыце з сабой

# МІЛАЯ СПАДАРЫНЯ

Творца не мае ўзросту. Ён працуе, стварае душой. А яна заўсёды маладая, бо жывіцца духам навакольнай прасторы, поўніцца яе хараством, што ніколі не знікае.

Паэзія Уладзіміра Пецюкевіча ўвабрала ў сябе і непаўторны водар роднай зямлі, і яе фарбы — някідкія, але такія разнастайныя, багатыя на адценні. Як беларускія краявіды, так і мастацкія строфы паэта выклікаюць роздум, развагу, абуджаюць патрыятычныя пачуцці. А ўдала выкарыстаная фальклорная сімволіка, вобразнае выяўленне народнага светаўспрымання ўзмацняюць грамадзянскае гучанне паэтычных радкоў. Таму яны і прыцягваюць увагу кампазітараў. Леанід Захлеўны і Мікалай Алешка, Алег Елісеенкаў і Павел Яроменка паклалі на музыку вершы У. Пецюкевіча. Найбольш плённае і працяглае яго супрацоўніцтва разгарнулася з Дзмітрыем Даўгалёвым.

Малады кампазітар, быўшы яшчэ студэнтам, на верш паэта напісаў песню «Поле горкіх палыноў», і яна ўвайшла ў рэпертуар ансамбля «Сябры». А потым у іх з'явілася больш за восем дзясяткаў вакальных твораў. Сярод іх — «Гаю мой, не кліч», «Балада», «Зарніцы», «Мелодыя сэрца», «Палачанка-князёўна», «Заспявай мне песню, крывічанка», «Белая лілея», «Пажадай мне, мама», якія спрыялі творчаму поспеху многіх спевакоў. Разам Д. Даўгалёў і У. Пецюкевіч стварылі араторыю «Зорка Палын», кантату «Дарога-сцяжына матулі і сына», рок-оперу «Агонь Праметэя», дзіцячую музычную казку «Птушыны кірмаш»...

Песня «Мілая спадарыня», напісаная напрыканцы мінулага стагоддзя, пяшчотна загучала на канцэртах Якава Навуменкі. І яна ўспрымаецца салаўіным хваласпевам вялікаму прыроднаму пачуццю — каханню.

**Верш Уладзіміра Пецюкевіча**
**Музыка Дзмітрыя Даўгалёва**

*Я сумую лебедзем,*
*у віры купаюся:*
*— Дзе ты, чарнабровая?*
*То журуся жоравам,*
*угару ўзнімаюся:*
*— Адгукніся, родная!*

***Прыпеў**:*
*Дзе ты, чарнабровая, дзе ты,*
*светла-русая?*
*Пра цябе я думаю,*
*думаю штодня.*
*Бела-беларусачка,*
*бела-беларусачка,*
*Мілая спадарыня!*

*То ў зары, то ў месяца*
*пра цябе пытаюся:*
*— Дзе мая заранaчка?*
*То спакойна веру я: з выраю*
*ты вернешся*
*Веснавой журавачкай.*

***Прыпеў**.*

*Мы з табою вернемся*
*да бацькоўскіх весніцаў,*
*Нізенька паклонімся,*
*Упрыгожым песнямі хату нашу веснаю —*
*Зноў на свет народзімся.*

***Прыпеў**.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**



■ Рэха публікацыі

# ЁСЦЬ ЖАДАННЕ — БУДЗЕ І ПАДТРЫМКА

**Дзякуючы навучэнцу Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа, члену БелТІЗ Валянціну Станкевічу, творы Івана Мележа, Васіля Быкава і іншых беларускіх аўтараў цяпер можна пачуць у DAISY-фармаце аўдыякніг для людзей з праблемамі зроку. Пра гэта расказвалася ў артыкуле «Фармат для невідушчых» («Звязда», 12 лютага 2012 г.).**

На сайце БелТІЗ пры падтрымцы беларуска-шведскага праекта створана DAISY-бібліятэка з фондам аўдыялітаратуры, які цяпер пашыраецца. Зручна: не трэба ісці ў звычайную бібліятэку, а можна дома загрузіць аўдыякнігу на сваім камп'ютары. Праўда, аднаго жадання мала — трэба валодаць DAISY-плэерам для праслухоўвання агучанай літаратуры. А гэты прыбор даступны не кожнаму, бо дорага каштуе.

Артыкул «Фармат для невідушчых» разгледжаны Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны. Вось што паведаміў намеснік міністра А. Румак:

— Згодна з Палажэннем аб парадку забеспячэння грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 11 снежня 2007 г. № 1722, інваліды 1 групы па зроку і дзеці-інваліды па зроку ад 7 да 18 гадоў забяспечваюцца прыстасаваннем для праслухоўвання агучанай літаратуры (плэерам) з аплатай 20 працэнтаў кошту гэтага сродку рэабілітацыі, а інваліды 2 групы — з аплатай 50 працэнтаў.

Варта адзначыць, што пазіцыя 41 Дзяржаўнага рэестра (пераліку) тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі ўключае ў сябе плэеры, у тым ліку МП3-плэер, МП4-плэер, DAISY-плэер і іншыя прылады для праслухоўвання агучанай літаратуры. Фінансаванне расходаў па забеспячэнні грамадзян гэтымі прыладамі ажыццяўляецца камітэтамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў. Пры гэтым мадэль плэера закупляецца кожным камітэтам з улікам фінансавых магчымасцяў рэгіёна.

**Для даведкі.** Кошт прылад для праслухоўвання агучанай літаратуры цяпер, напрыклад, складае: MP3-плэер Ritmix RF-3300 4 GB — ад 150000 руб., Mystery-плэер — ад 760000 руб., DAISY-плэер — ад 1,6 мільёна рублёў.

Летась у рэспубліцы камітэтамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне 313 інвалідаў па зроку забяспечаны прыладамі для праслухоўвання агучанай літаратуры. Камітэтам Гродзенскага аблвыканкама — 39 інвалідаў па зроку, з іх 10 атрымалі DAISY-плэеры бясплатна ў рамках беларуска-шведскага праекта.

Такім чынам, ёсць жаданне — будзе і падтрымка. У прыватнасці, старшыні Гродзенскай абласной арганізацыі БелТІЗ Ірыне Новікавай з камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама паведамілі, што плануецца ў бліжэйшы час купіць шэраг прылад для праслухоўвання агучанай літаратуры, у тым ліку 10 DAISY-плэераў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Нават калі ваша галава перапоўнена ідэямі, паспрабуйце не прымаць на пачатку тыдня сур'ёзных рашэнняў: магчыма, вы атрымаеце вестку, якая ў корані зменіць планы і намеры. Пачынаючы з серады, уважлівей пастаўцеся да сябе, нават калі на навакольных увагі ўжо не хапае. У суботу адмоўцеся ад удзелу ў таемнай змове: выгаду гэтай адмовы вы ацэніце пасля.

**ЦЯЛЕЦ.** Магчымая досыць вострая барацьба з канкурэнтамі, зрэшты, вялікія шанцы выйсці з яе пераможцам і даказаць навакольным сваю здольнасць з бляскам пераадольваць шматлікія цяжкасці. Дзеці ці іншыя члены сям'і могуць запатрабаваць пэўных капіталаўкладанняў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Варта паспрабаваць прымаць падзеі такімі, як яны ёсць, без адчайных спроб іх змяніць. Так вы зможаце дасягнуць максімальных вынікаў. Падводзячы нейкі вынік, зазірніце ў будучыню і прыслухайцеся да ўнутранага голасу — вы зразумееце, усё зусім не так дрэнна. Добрыя навіны ў чацвер дададуць аптымізму і ўпэўненасці ва ўласных сілах.

**РАК.** Тыдзень удалы ў шмат якіх сферах. Паспрабуйце арыентавацца не толькі на сябе, але ўлічваць інтарэсы дзелавых партнёраў і іншых зацікаўленых бакоў. Вы толькі выйграеце, калі пойдзеце на нязначныя саступкі. Паспрабуйце не звязваць сябе ніякімі абавязацельствамі: вам спатрэбіцца пэўная асцярожнасць, каб пазбегнуць канфліктных сітуацый.

**ЛЕЎ.** Вас будуць чакаць плённыя дні, як на працы, так і дома. Выкарыстоўваючы такія якасці, як пачуццё такту і разумны сэнс, зможаце дасягнуць проста бліскучых вынікаў. Добра пойдуць папяровыя справы, такія, як падрыхтоўка ўсялякіх юрыдычных ці фінансавых дакументаў. Паспрабуйце рэальна ацэньваць свае сілы і магчымасці, не браць на сябе такі аб'ём працы, з якім вы не зможаце справіцца без шкоды для здароўя.

**ДЗЕВА.** Вас чакае поспех на працы. Мабілізуйце свае сілы для калектыўнай дзейнасці і для цікавых праектаў. Зможаце заняць ролю лідара і арганізатара. Паспрабуйце своечасова выпраўляць дапушчаныя памылкі. Старайцеся не злавацца на калег за залішнюю стараннасць і дробныя падбухторванні. Папяровая цяганіна на працы можа трохі расчараваць вас, але пастаўцеся да працэсу па-філасофску. Чым больш вытрыманымі вы будзеце, тым лягчэй атрымаецца канструктыўна вырашаць праблемы.

**ШАЛІ.** Вы не павінны ўпускаць спрыяльных шанцаў, якія падкіне вам лёс на гэтым тыдні. Усё будзе атрымлівацца лёгка, як бы само па сабе. У першай палове тыдня задавальненне прынясе нават руцінная частка працы, а ўжо пра дзейнасць асэнсаваную і казаць няма чаго: важныя кантакты, перамовы і паездкі прынясуць бліскучыя вынікі. Толькі звярніце пільную ўвагу на новых партнёраў: не выключана, што сярод іх можа аказацца таемны нядобразычлівец.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень абяцае неверагодны поспех у рэалізацыі ідэй і планаў. Адкіньце дробныя дэталі, сканцэнтруйцеся на самым галоўным, цяпер вы можаце здзейсніць у вызначаных справах адчувальны крок наперад. Будзьце дыпламатычнымі, цвёрда, але ў той жа час карэктна адстойвайце ўласныя інтарэсы пры зносінах з начальствам.

**СТРАЛЕЦ.** Актуальным можа стаць філасофскае пытанне пра сэнс жыцця, толькі не занадта замыкайцеся ў сваім унутраным свеце. Можаце аказацца ў незнаёмым становішчы, і вам ізноў давядзецца заваёўваць месца пад сонцам. Будзьце асцярожнымі, паспрабуйце прадбачыць непрыемнасці і абыходзіць іх бокам. Верагодная прапанова, якая дазволіць папоўніць фінансавыя запасы. Нязломны аптымізм з'явіцца залогам душэўнага спакою для сям'і.

**КАЗЯРОГ.** Аптымізм дазволіць справіцца з любой праблемай тыдня. Практычна ўсе дні, за выключэннем чацвярга, вам будзе спадарожнічаць лёгкасць, якая дазваляе віртуозна пераадольваць перашкоды, што ўзнікаюць. Тыдзень спрыяе карысным знаёмствам і атрыманню важнай інфармацыі. Паспрабуйце фіксаваць свае ідэі на паперы, гэта першы крок да іх увасаблення.

**ВАДАЛЕЙ.** Настае спрыяльны час для буйных праектаў. Калі спатрэбіцца дапамога, не саромейцеся не толькі прыняць прапанаваную, але і самому папрасіць кагосьці штосьці зрабіць для вас. Паспрабуйце спакойна паставіцца да невялікіх выпрабаванняў, якія вам падрыхтаваў лёс. Сціпласць і ўменне чуць, а таксама аналітычныя здольнасці дапамогуць дасягнуць многага. Не прымайце паспешлівых рашэнняў — інтуіцыя сёння не працуе.

**РЫБЫ.** Паспрабуйце дакладна распланаваць справы на ўвесь тыдзень, магчыма, нялішне будзе скласці графік у пісьмовым выглядзе. Першая палова тыдня будзе больш паспяховай, чым другая, але не варта прыспешваць падзеі, лепш усё рабіць у свой час. Не варта ісці на рызыку, нават калі вы абсалютна ўпэўнены ў выйгрышы. Расчараванне будзе здольна надоўга сапсаваць настрой, ды і ў фінансавым плане можа аказацца нятанным. Не выключана, што створыцца сітуацыя, калі найвышэйшую каштоўнасць набудзе самавалоданне — будзьце гатовыя ўзяць сябе ў рукі ў патрэбны момант.

**Извещение о проведении открытого аукциона на повышение начальной цены**

**Предмет аукциона № 1** – имущество, расположенное по адресу: Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 (цех ширпотреба, инв. номер 110/С-87292, общая площадь – 386,1 кв. м; здание участка переработки дерева, инв. номер 110/С-91783, общая площадь – 559,1 кв. м; здание механического цеха, инв. номер 110/С-91788, общая площадь – 337,3 кв. м; теплица, инв. номер 110/С-87267, общая площадь – 140,8 кв. м; зеленые насаждения (деревья – 57 шт., кустарник – 1 шт., газон площадью 3393,8 кв. м)). Площадь земельного участка - 1,2605 га.

Начальная цена - 699 570 000 бел. рублей без НДС, сумма задатка – 70 000 000 бел. рублей.

**Предмет аукциона № 2** - имущество, расположенное по адресу: Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 (здание производственное общей площадью 104,3 кв. м, инв. номер 110/С-91789; буфет общей площадью 157,2 кв. м, инв. номер 110/С-87252; гараж общей площадью 22,3 кв. м, инв. номер 110/С-94176; котельная общей площадью 263,3 кв. м, инв. номер 110/С-87257; биллиардная общей площадью 57,7 кв. м, инв. номер 110/С-87265; административно-бытовое здание общей площадью 119 кв. м, инв. номер 110/С-87279; красный уголок общей площадью 136,5 кв. м, инв. номер 110/С-87291; склад топлива общей площадью 288,1 кв. м, инв. номер 110/С-87273; туалет, площадь застройки 4,55 кв. м, инв. номер бухг. 710; забор железобетонный общей площадью ограждения 152,75 кв. м, инв. номер бухг. 70; пожарный водоем емкостью 60 куб. м, инв. номер бухг. 71; теплотрасса, длина сети 65 м, инв. номер бухг. 57; водопроводная сеть, длина сети 112,5 м, инв. номер бухг. 549; зеленые насаждения (деревья), 12 шт.; зеленые насаждения (газоны), общая площадь 1575 кв. м; зеленые насаждения (цветник), общая площадь 11 кв. м; камера сушильная КС-60-РЭ, инв. номер бухг. 556; котел паровой Е-1/9-1, инв. номер бухг. 8). Площадь земельного участка - 0,5212 га.

Начальная цена - 1 027 698 840 бел. рублей без НДС, сумма задатка – 100 000 000 бел. рублей.

**Предмет аукциона № 3** - имущество, расположенное по адресу: Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 (проходная общей площадью 17,6 кв. м, инв. номер 110/С-87282; цех возвратной тары общей площадью 440,6 кв. м, инв. номер 110/С-87259; блок склада хранения общей площадью 598,6 кв. м, инв. номер 110/С-87273; дорога благоустроенная общей площадью покрытия 465 кв. м, инв. номер бухг. 69; забор железобетонный протяженностью 120 м, инв. номер бухг.70; ворота протяженностью 6,5 м, инв. номер бухг.707; водопроводная сеть длиной 5 м, инв. номер бухг. 549; линия электропередач протяженностью 170 м, инв. номер бухг. 550; зеленые насаждения (деревья -75 шт.); зеленые насаждения (кустарники – 4шт.); зеленые насаждения (газоны)). Площадь земельного участка - 1,2032 га.

Начальная цена - 1 986 952 000 бел. рублей без НДС, сумма задатка – 190 000 000 бел. рублей.

| № п/п | Наименование показателей | На 1 января 2013 г. | На 31 декабря 2011 г. | № п/п | Наименование показателей | На 1 января 2013 г. | На 31 декабря 2011 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | 3 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| | в том числе: | | | | в том числе: | | |
| 1.1 | долгосрочные активы | 150 042 | 91 472 | **3.1** | **долгосрочные обязательства** | **13 061** | **1 591** |
| | в том числе: | | | | в том числе: | | |
| 1.1.1 | основные средства | 137 941 | 80 270 | 3.1.1 | долгосрочные кредиты и займы | 6 603 | 1 486 |
| 1.1.2 | нематериальные активы | 268 | 298 | 3.1.2 | долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 6 437 | 105 |
| 1.1.3 | доходные вложения в материальные активы | 6 391 | 8 836 | 3.1.3 | отложенные налоговые обязательства | 21 | - |
| 1.1.4 | вложения в долгосрочные активы | 163 | - | 3.1.4 | доходы будущих периодов | - | - |
| 1.1.5 | долгосрочные финансовые вложения | 2 | 2 | 3.1.5 | резервы предстоящих платежей | - | - |
| 1.1.6 | отложенные налоговые активы | 3 | - | 3.1.6 | прочие долгосрочные обязательства | - | - |
| 1.1.7 | долгосрочная дебиторская задолженность | - | - | 3.2 | краткосрочные обязательства | 48 459 | 12 300 |
| 1.1.8 | прочие долгосрочные активы | 5 274 | 2 066 | | в том числе: | | |
| **1.2** | **краткосрочные активы** | **71 966** | **28 826** | 3.2.1 | краткосрочные кредиты и займы | - | 1 710 |
| | в том числе: | | | 3.2.2 | краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 1 120 | 1 265 |
| 1.2.1 | запасы | 24 151 | 9 457 | 3.2.3 | краткосрочная кредиторская задолженность | 43 559 | 6 491 |
| 1.2.2 | долгосрочные активы, предназначенные для реализации | - | - | 3.2.4 | обязательства, предназначенные для реализации | - | - |
| 1.2.3 | расходы будущих периодов | 12 317 | 2 892 | 3.2.5 | доходы будущих периодов | 41 | - |
| 1.2.4 | налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 5 320 | 714 | 3.2.6 | резервы предстоящих платежей | - | - |
| 1.2.5 | краткосрочная дебиторская задолженность | 4 048 | 4 343 | 3.2.7 | прочие краткосрочные обязательства | 3 739 | 2 834 |
| 1.2.6 | краткосрочные финансовые вложения | - | - | 4 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, принимаемые к расчету (строка 3.1 + строка 3.2)** | **61 520** | **13 891** |
| 1.2.7 | денежные средства и их эквиваленты | 26 130 | 11 417 | 5 | **Стоимость чистых активов (строка 2 - строка 4)** | **160 488** | **106 407** |
| 1.2.8 | прочие краткосрочные активы | - | 3 | | | | |
| 2 | **АКТИВЫ, принимаемые к расчету (строка 1.1 + строка 1.2)** | **222 008** | **120 298** | | | | |

***Руководитель*** ***Г.В.Зубарев*** ***Главный бухгалтер*** ***Т.В.Зубович***

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Банковский процессинговый центр» за период с 01.01.2012 по 31.12.2012

Генеральному директору ОАО «Банковский процессинговый центр» Зубареву Г.В.

**Аудируемое лицо:**

открытое акционерное общество «Банковский процессинговый центр»;

место нахождения и юридический адрес организации: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Дзержинского, д. 69, корп. 1, каб. 618 соответствует фактическому расположению.

ОАО «Банковский процессинговый центр» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 02.09.2005 № 1542 в Едином государственном регистре за № 190381773;

свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации ОАО «Банковский процессинговый центр» № 0109544 выдано Минским городским исполнительным комитетом 06.09.2005;

в качестве плательщика налогов ОАО «Банковский процессинговый центр» поставлен на учет в Инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Московскому району г. Минска.

УНП 190381773 ОКПО 37579779

**Аудиторская организация:**

республиканское унитарное предприятие «Служба ведомственного контроля при Министерстве архитектуры и строительства Республики Беларусь» (далее — Исполнитель, Служба), ул. Мясникова, 39, 220048, г. Минск. Телефон 213 64 34;

свидетельство о государственной регистрации от 18.12.2001 № 1745, выданное решением Минского городского исполнительного комитета.

УНП 100055051.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Банковский процессинговый центр», состоящей из:

бухгалтерского баланса на 31.12.2012;

отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств, приложения к бухгалтерскому балансу за январь–декабрь 2012 г., пояснительной записки, расчета чистых активов на 01.01.2013.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Банковский процессинговый центр», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Банковский процессинговый центр» на 1 января 2013 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2012 г., при этом совершенные ОАО «Банковский процессинговый центр» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

Директор
РУП «Служба ведомственного контроля при Минстройархитектуры» С.П. Соц

Руководитель аудиторской группы — заместитель начальника управления аудита РУП «Служба ведомственного контроля при Минстройархитектуры» П.Н. Нехай

«20» 02 2013 г. (дата получения)

# БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ОАО «Торговый центр «Уручье» на 01.01.2013 год

*УНП 101081643, г. Минск, ул. Руссиянова, д. 36, тел./017/ 260-81-51, 284-73-65*

| АКТИВ | Млн. руб. |
|---|---|
| **1. ДОЛГОСРОЧНЫ АКТИВЫ** | 1 711 |
| Основные средства | 1 493 |
| Нематериальные активы | 204 |
| Прочие долгосрочные активы | 14 |
| **2. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | 8 866 |
| Запасы | 4 061 |
| В том числе: - материалы | 124 |
| - готовая продукция и товары | 3 937 |
| Расходы будущих периодов | 4 |
| налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 85 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 453 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 2 070 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 2 193 |
| **БАЛАНС** | **10 577** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | Млн. руб. |
|---|---|
| **1. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | **2 898** |
| Уставный капитал | 502 |
| Добавочный капитал | 89 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 2 307 |
| **2. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **452** |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 452 |
| **3. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **7 227** |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 7 227 |
| В том числе: - поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 6 725 |
| - по авансам полученным | 10 |
| - по налогам и сборам | 212 |
| - по социальному страхованию и обеспечению | 51 |
| - по оплате труда | 228 |
| - прочим кредиторам | 1 |
| **БАЛАНС** | **10 577** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2012 год ОАО «Торговый центр «Уручье»

| Наименование показателей | Млн. руб. |
|---|---|
| Валовая прибыль | 8 969 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 1 423 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 140 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 253 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 1 310 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 121 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 74 |
| Доходы по финансовой деятельности | 504 |
| Расходы по финансовой деятельности | 487 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 65 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 1 375 |
| Налог на прибыль | 290 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 2 |
| Чистая прибыль (убыток) | 1 083 |
| Совокупная прибыль (убыток) | 1 093 |

## Информация об ОАО «Торговый центр «Уручье» и его деятельности

1. **Количество акционеров** ОАО «Торговый центр «Уручье»: всего 8, в том числе юридических лиц – 5 и физических лиц – 3.
2. **Информация о дивидендах и акциях за 2012 год**:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период |
|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. рублей | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. рублей | 999.00 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | - |

3. **Информация о задолженности:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период |
|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | млн. рублей | - |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн. рублей | - |

4. **Среднесписочная численность** работающих (человек) – 65.
5. **Основные виды продукции или виды деятельности**, по которым получено двадцать и более процентов выручки, – розничная торговля (включая алкогольные напитки и табачные изделия) и общественное питание.

*Директор ОАО «Торговый центр «Уручье»* *Н.В.Алейникова*

*Главный бухгалтер* *Е.Э.Казак*

Утерянные страховые полисы ЗСАО «БелИнгострах» добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии ИС №№ 0354343, 0354344, 0354345, 0354346, 0449515 **считать недействительными.** УНП 100219645

Утерянные бланки страховых полисов серии НС №№ 0215572-0215584, 0225634-0225636, 0225656-0225660, 0237161-0237164, 0237166-0237170, 0237178-0237180, 0246880, 0255393, 0255723, 0255726, 0255728, 0262953, 0262955, 0263787, 0264644, 0264686, 0267102, 0267397-0267398, 0273996, 0273998, 0278368, 0278706, 0280322-0280323, 0280524, 0280533-0280534, 0281450, 0281944, 0281947, 0285335, 0285340, 0289694, 0289738, 0294372, 0297681, 0300118-0300119, 0303979-0303980, 0304585, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительными.** УНП 101063229

# ОАО «Трикотажторг»

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2012 года

(млн руб.)

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2012 г. | На 31 декабря 2011 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | 110 | 10 611 | 7 806 |
| Нематериальные активы: | 120 | 1 | 1 |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 10 612 | 7 807 |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 6 160 | 4 239 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 62 | 58 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 64 | 42 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 7 272 | 4 289 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 398 | 2 997 |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 15 956 | 11 625 |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **26 568** | **19 432** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2012 г.** | **На 31 декабря 2011 г.** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 132 | 1 132 |
| Резервный капитал | 440 | 253 | 387 |
| Добавочный капитал | 450 | 8 843 | 6 258 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 4 686 | 3 740 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **14 914** | **11 517** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 1 | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **1** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | 134 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 11 653 | 7 781 |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 11 653 | 7 915 |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **26 568** | **19 432** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2012 г.

(млн руб.)

| Наименование показателей | Код строки | за 2012 г. | за 2011 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 69 743 | 45 326 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (59 339) | (38 699) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | **10 404** | **6 627** |
| Расходы на реализацию | 050 | (8 158) | (5 064) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | **2 246** | **1 563** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 3 864 | 2 560 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (4 854) | (3 519) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (+-060+070-080) | 090 | **1 256** | **604** |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 358 | 665 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (82) | (122) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 1 645 | 3 392 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 476) | (1 219) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130+-140) | 150 | **445** | **2 716** |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (+-090+-150) | 160 | **1 701** | **3 320** |
| Налог на прибыль | 170 | (433) | (1 006) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 190 | (1) | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (2) | |
| Чистая прибыль (убыток) (+-160-170+-180+-190-200) | 210 | **1 265** | **2 314** |

Количество акционеров , всего – 24, в том числе: юридических лиц – 2, физических лиц – 22.

| Наименование показателя | Ед. измер. | За отчетный период | За аналог. период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов | млн руб. | 177,2 | 323,9 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 2347,3 | 4291,7 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 197,6 | 152,6 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | - | - |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 1 603 | 108 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | 2 588 | - |

Среднесписочная численность работающих (человек) – 114.
Основные виды продукции или виды деятельности по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **оптовая торговля товарами народного потребления, розничная торговля товарами народного потребления, операции с недвижимым имуществом.**

**Генеральный директор** **И.Э. Кобза**

**Главный бухгалтер** **О.Ф. Величко**

# РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 26 апреля 2013 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Помещение на 2-м этаже капитального строения, здания 21 городского отделения связи (инв. № 100/С-45930), по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Орловская, д. 24 | 2 523 150 | 252 315 | 186,9, в т.ч. 165,5 (19,2; 14,5; 14,3; 16,7; 13,7; 11,4; 10,6; 65,1) всп.пл. 21,4 (8,1; 6,1; 1,0; 1,5; 4,7) | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств) |

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды** |
| **Наименование арендодателя** | **РУП «Белпочта»** |
| **Срок договора аренды** | **5 лет** |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений. 2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка. 3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в рег. дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанканк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 26 апреля 2013 г. в 11.00 (лот № 1) по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

**1.** Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

**2.** Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

**3.** Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**4.** Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**5.** Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**6**. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

**7.** При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: *г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329* в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 25 апреля 2013 г. до 17.00. Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Аукцион состоится 10 апреля 2013 года в 11.00 в здании Озерского сельского исполнительного комитета (аг. Озеры, ул. Красноармейская, 1).**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Озеры, ул. Красноармейская, 1, с 8.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 5 апреля 2013 г. до 15.00.**

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, руб. | Инженерная инфраструктура |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | 422086507601000066, Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, Озерский сельсовет, д. Старина, участок № 12 (по генплану). | **0,1100** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) | **8 000 000** | **1 600 000** | **7 500 000** | электричество |
| 2 | 422086507601000067, Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, Озерский сельсовет, д. Старина, участок № 13 (по генплану). | **0,1096** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) | **8 000 000** | **1 600 000** | **7 500 000** | электричество |

Для участия в аукционе гражданин лично либо через своего представителя со дня опубликования настоящего извещения и до 15.00 05.04.2013 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды и продажи в частную собственность земельных участков по адресу: аг. Озеры, ул. Красноармейская, 1, документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Озерского сельисполкома, ЦБУ № 421 филиала № 400 – ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» код банка 752, № 3641514084213, УНН 500045147;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане либо представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное рабочее время в течение установленного срока приема заявлений. Контактные телефоны: 974-071, 931-374, 931-623.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Шаг аукциона – 10 % от предыдущей цены, называемой аукционистом.

Земельный участок предоставляется с условиями:

внесения в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания его несостоявшимся платы за земельный участок на расчетный счет в Главном управлении МФ по Гродненской области № 3600514080131 в филиале № 400 ГОУ АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, УНН 500563252, назначение платежа 04901;

внесения в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания его несостоявшимся платы за возмещения затрат на организацию и проведение аукциона продажи на расчетный счет в Главном управлении МФ по Гродненской области № 3600514080131 в филиале № 400 ГОУ АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, УНН 500563252, назначение платежа 04616;

обращения в течение двух месяцев со дня получения выписки из решения для осуществления государственной регистрации возникновения права собственности на земельный участок и ограничения права на него;

занятия земельного участка в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома;

снятия на земельном участке плодородного слоя почвы из-под пятен застройки после получения разрешительной документации на строительство жилого дома и использования его для благоустройства участка.

■ «Еўрабачанне-2013»

# ШОУ СА СМАКАМ ПЕРЦУ І ПАХАМ БУЗІНЫ

**Прадзюсары сёлетняга зборна-еўрапейскага песеннага шоу, што пройдзе 14—18 мая ў Швецыі, адмовіліся ад традыцыйнага лёсавання канкурсантаў і вызначаць парадак выступлення артыстаў самастойна. Такой навіной збянтэжыла прыхільнікаў конкурсу кіраўнік нацыянальнага беларускага адбору Вольга Шлягер пасля сустрэчы кіраўнікоў дэлегацый у Мальмё.**

## ЛЕГКАКРЫЛЫ МАТЫЛЁК

«Прадзюсары шоу вырашылі яшчэ раз прагледзець выступленні ўсіх паўфіналістаў. 29 сакавіка яны будуць гатовыя назваць парадак выступленняў удзельнікаў, сярод якіх у першым паўфінале і наша Алёна Ланская. Выканаўчы прадзюсар конкурсу Ён Ола Санд патлумачыў, што «галоўная задача зрабіць так, каб кожная песня на конкурсе ззяла». А ўжо 17 мая, пасля правядзення абодвух паўфіналаў, стане вядомы парадак выступлення фіналістаў», — паведаміла **Вольга Шлягер.** Жэрабем быў вызначаны толькі парадкавы нумар краіны-арганізатара — Швецыя выступіць у фінале шоу пад нумарам 16.

Дарэчы, падчас сустрэчы арганізатары шоу назвалі папярэднія даты наступнага конкурсу — 13-17 мая 2014 года. Сёлета ж галоўная сцэна конкурсу будзе збудавана з выкарыстаннем найноўшых матэрыялаў. Афармленне сцэны і ўсяго шоу будзе стылізаванае пад крылы матылька.

Праўда, лёгкасць палёту матылькоў распаўсюджваецца не на ўсе новаўвядзенні і змяненні правілаў «Еўрабачання-2013». Бадай, найважнейшае з іх — новая сістэма галасавання. Галасы ад гледачоў і журы не будуць пераводзіцца ў традыцыйную сістэму ад 1 да 12 балаў, а адлюструюць поўныя рэйтынгі з першага да апошняга месцаў. І толькі потым дзясятак выканаўцаў, што набяруць найбольшыя балы, будзе пераведзены ў звыклую сістэму. Як мяркуюць прадзюсары шоу, гэта правіла дазволіць, нарэшце, супрацьстаяць галасаванню дыяспар і краін-суседзяў — але дагэтуль яно выклікае сярод прыхільнікаў і прафесійных крытыкаў конкурсу гарачыя спрэчкі.

Нагадаем, у сёлетнім конкурсе бяруць удзел 39 краін. На год адышлі ад «Еўрабачання» Боснія і Герцагавіна, Партугалія, Славенія і Турцыя. Арменія, наадварот, вярнулася пасля перапынку.

## ЗОРКА ПА ІМЕНІ САЛЕО

Перамена конкурснай песні Алены Ланской відавочна пайшла на карысць. Прынамсі, пасля таго, як айчыннага розліву песня «Rhythm of Love», з якой спявачка выйграла нацыянальны адбор, саступіла месца хіту «Solayoh» бельгійска-брытанскага дуэта аўтараў Марка Пелінка і Марціна Кінга, Беларусь у прагнозах вядомай букмекерскай канторы William Hill узнялася ажно на 4 месца ў фінале! Праўда, крыху пазней «упала» на 9-ую пазіцыю, а цяпер месціцца ў раёне 6-7 — і ўжо некалькі тыдняў упэўнена трымаецца ў першай дзясятцы фіналістаў.

Магчыма, на прагнозных паказчыках станоўча адаб'ецца і афіцыйны кліп на песню беларускай удзельніцы «Еўрабачання-2013». Яго беларускі бок не паспеў змантаваць да сустрэчы кіраўнікоў дэлегацый краін-удзельніц конкурсу, але ў найбліжэйшыя дні праца будзе скончана, і гледачы змогуць ацаніць відэа. У гэтым «Звязду» запэўніў **прадзюсар спявачкі Дзмітрый Баранаў.** «Засталіся апошнія штрыхі. Магу сказаць, што да канца тыдня дакладна адбудзецца прэм'ерны паказ», — падзяліўся прадзюсар. Чакаем з нецярплівсцю. А пакуль трымаем у галаве, што здымаўся кліп у Турцыі, а ўдзел у ім, акрамя ўласна Алены Ланской, узялі ажно 30 чалавек танцораў з Сербіі і пераможца «Еўрабачання-2009» Аляксандр Рыбак, які абсалютна бясплатна сыграў эпізадычную ролю.

Сама ж песня распавядае пра нейкую міфічную планету, на якой жывуць вельмі добрыя і адкрытыя людзі, якія радуюцца жыццю, напаўняюць сэрцы любоўю да ўсіх і верацъ у цуды. Дадайце да гэтай аптымістычнай казкі выразную ўсходнюю стылістыку завадной мелодыі і адмысловы танец і атрымаецца нешта вельмі цікавае і для Беларусі незвычайнае. Цяпер ідуць перамовы з некалькімі рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі наконт будучага конкурснага нумара — ён відавочна вымагае экспрэсіўнай падтанцоўкі. Але дакладнай канцэпцыі ў беларусаў пакуль няма, і, хутчэй за ўсё, пастаноўку будзе рабіць таксама інтэрнацыянальная каманда. Алена Ланская, якая днямі адпрацавала са шведскай здымачнай групай для відэавізітоўкі краіны, рыхтуецца да працягу свайго прома-тура — напрыклад, у красавіку запланавана выступленне ў Вялікабрытаніі.

— Ці адсочваеце вы прагнозы букмекераў? — пацікавіліся мы ў Дзмітрыя Баранава.

— Так, але разумею, што іх нельга ўспрымаць як догму, заспакойвацца ці, наадварот, адчайвацца. Бо нярэдка былі выпадкі, калі букмекеры памыляліся ў прагнозах.

## ЧЫМ ПАХНЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ»?

Сёлета дазнацца пра гэта зможа кожны ахвотны — днямі былі прэзентаваны афіцыйныя водары конкурсу. Больш за тое, кампанія Foodism распрацавала і адмысловыя смакі «Еўрабачання», пакаштаваць якія можна будзе ў маі: бузіна, духмяная мята, рабабар і чырвоны перац мусяць прадставіць поўны смакавы і духмяны букет Скандынавіі.

Дарэчы, некалькі гадоў таму песню з водарам, у добрым сэнсе гэтага слова, прывозіла на «Еўрабачанне» і Беларусь — гурт «3+2» браў з сабой знарок распрацаваную парфуму і цацку-матылька — пад песню «Butterfly». Адчуваеце пэўнае дэжавю?..



Здымкі відэавізітоўкі Алены Ланской.

Сёлета, запэўніваюць у адзін голас прадстаўнікі Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі і прадзюсарскага цэнтра «Спамаш», беларуская ўдзельніца конкурсу таксама прадставіць цікавы прома-пакет з сувенірамі. Балазе, са спонсарскім фінансаваннем у артысткі праблем няма. Але што менавіта ўвойдзе ў прома-пакет, пакуль не раскрываецца. Магчыма, падказку наконт аднаго з кампанентаў даў Аляксандр Рыбак, якому Алена Ланская прэзентавала шакалад «Алёнка». «Тут мусіць быць твой фотаздымак!» — з заўсёднай сваёй непасрэднасцю пракаментаваў падарунак артыст.

## ТЫМ ЧАСАМ

У Беларусі пачалася падрыхтоўка да наступнага «Еўрабачання» — дзіцячага, якое пройдзе ў лістападзе 2013 года ў Кіеве. Рэспубліканскі адбор удзельнікаў абвясціла Белтэлерадыёкампанія. Да ўдзелу запрашаюцца юныя выканаўцы ва ўзросце ад 10 да 15 гадоў з песнямі на беларускай ці рускай мове працягласцю да 2 хвілін 45 секунд. Заяўкі трэба адпраўляць да 10 чэрвеня ўключна каштоўнымі бандэролямі на адрас: 220807, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9, з паметкай «На рэспубліканскі конкурс «Песня для Еўрабачання». Фінал нацыянальнага адбору папярэдне прызначаны на верасень, яго пераможцу традыцыйна выбяруць гледачы і журы.

Украіна пайшла яшчэ далей — тут стартаваў міжнародны тэлепраект «Музычная акадэмія Еўрабачання», удзел у якім бяруць дзеці з Расіі і Украіны. Прычым калі ўкраінцы спаборнічаюць за пуцёўку на «Дзіцячае Еўрабачанне», то расіяне ў выпадку перамогі будуць усяго толькі запрошаны на конкурс у якасці гасцей.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1530** год — нарадзіўся Васіль Цяпінскі (Амельяновіч-Цяпінскі Васіль Мікалаевіч), беларускі гуманіст-асветнік, кнігавыдавец, пісьменнік, перакладчык. Быў сучаснікам і аднадумцам Сымона Буднага, прадаўжальнікам гуманістычных і культурна-асветніцкіх традыцый Францыска Скарыны. Служыў у коннай роце аршанскага старасты Ф. Кміты-Чарнабыльскага, у 1560-я гады — у падканцлера ВКЛ Валовіча. Па некаторых звестках, у сваім радавым маёнтку Цяпіна (цяпер Чашніцкі раён) арганізаваў друкарню, дзе надрукаваў «Евангелле» паралельна на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. Выданне ўпрыгожана ініцыяламі, наборным арнаментам, шрыфт стылізаваны пад шрыфты кніг Ф. Скарыны і С. Буднага, што сведчыць аб пераемнасці друкавана-выдавецкіх традыцый. Прадмова да яго (захавалася ў рукапісе) — адзін з найлепшых узораў беларускай патрыятычнай публіцыстыкі XVI ст. Вялікі аматар кніг, ён сабраў каштоўную бібліятэку, неабходную для выдавецкай дзейнасці. Даследчыкі мяркуюць, што ў 1562 годзе Цяпінскі надрукаваў у Нясвіжы два творы Сымона Буднага — «Катэхізіс» і «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Дзейнасць В. Цяпінскага спрыяла зараджэнню, уздыму і кансалідацыі шырокага нацыянальна-культурнага і патрыятычнага руху ў Беларусі ў канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя. Памёр пасля 1600 года.

**1876** год — рускі інжынер-электратэхнік Павел Яблачкаў атрымаў у Парыжы патэнт на вынаходства «электрычнай свечкі». Свечка Яблачкава ўяўляла сабой два стрыжні, раздзеленыя ізаляцыйнай пракладкай. Кожны са стрыжняў заціскалі ў асобнай клеме падсвечніка. На верхніх канцах запальваўся дугавы разрад, і полымя дугі ярка свяціла, паступова спальваючы вуглі і выпараючы ізаляцыйны матэрыял. На радзіме вучонага вынаходка прымянення не знайшла. Затое на выставе фізічных прыбораў у Лондане яна зрабіла сапраўдны фурор, а праз некаторы час лямпачкі «яблочкофф» сталі асвятляць і Елісейскія палі, і палацы персідскага шаха і караля Камбоджы. Пасля дэманстрацыі «свечкі» на Сусветнай выставе ў Парыжы ў 1879 годзе ў Францыі нават стварылі «Генеральную электрычную кампанію» з капіталам у 7 мільёнаў франкаў. Кампанія атрымала ўсе патэнты Яблачкава і такім чынам стала валодаць манапольным правам на распаўсюджванне «рускага святла» па ўсім свеце. Сам Яблачкаў працаваў у кампаніі сціплым кіраўніком тэхнічнага аддзела.



**1906** год — нарадзіўся (горад Чэрыкаў) Ісак Ісакавіч Любан, вядомы беларускі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У 1928-36 гг. працаваў мастацкім кіраўніком музычнага вяшчання Беларускага радыё, у 1937-41 гг. — Ансамбля песні і танца Беларускай філармоніі. У 1933-38 гг. быў старшынёй праўлення Саюза кампазітараў Беларусі. Аўтар вакальна-сімфанічнай сюіты «Граніца ў песнях», аўтар многіх песень, у тым ліку «Бывайце здаровы», музыкі да кінафільма «Гадзіннік спыніўся апоўначы». У 1942 годзе кампазітар, знаходзячыся пасля ранення ў шпіталі, напісаў музыку да песні «Наш тост». У маі 1942 года песня была выканана ў Маскве на канцэрце майстроў беларускага мастацтва і мела вялікі поспех. Выконвала яе народная артыстка СССР Ларыса Александроўская. З той пары «Наш тост» уключылі ў свой рэпертуар многія вядомыя артысты і франтавыя ансамблі. З'явіліся розныя варыянты тэксту. Пісаў таксама музыку да радыёпастановак, спектакляў драматычных тэатраў. У 1946 годзе за музыку да спектакля «Несцерка» быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1975 годзе.

Было сказана

**Міхась Стральцоў (1937—1987), пісьменнік, літаратуразнаўца:**

*«Я — голас і думка, я — праўда і зрок.*
*Даў мову я камню, траве і расінцы.*
*Мой дзень — не імгненне, — планеты віток,*
*Друкую свой крок на сусветным гасцінцы».*



Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Футбол. Валейбол. «Данута». Ратан. Каноэ. Енк. Гонар. Верш. Лесаруб. Ода. Ібсэн. Сані. Канада. Сак. Жырафа. Букі. Рок. Літ. Сачок. Сінап. Нут. Крык. Тараса. Арбат. Кама. Арат. Меніск. Арктыка.

**Па вертыкалі:** Партулак. Баскетбол. Кесон. Асілак. Нарада. Іпр. Орда. Акот. Рэгбі. Каркас. Янка. Барк. Тэніс. Драма. Астра. Тата. Нерон. Сэт. Рыга. Квас. Абарона. Хрэн. Фокус. Ірак. Табліца.

■ Дапамога

## ЖЫВЁЛАМ — ДАДАТКОВЫ «ПАЁК»

**Паляўнічыя гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі арганізавалі дадатковы прыкорм дзікіх лясных жывёл у сувязі з высокім снегавым покрывам, які ўтварыўся пасля цыклону, што накрыў краіну нядаўна.**

— Гэтыя меры прыняты з мэтай недапушчэння скарачэння колькасці дзікіх жывёл і птушак. Больш за ўсё снегу выпала на тэрыторыі Бярэзінскага, Горацкага, Мінскага і Стаўбцоўскага доследных лясгасаў, — паведаміла прэс-сакратар Мінлясгаса Ружэна Навіцкая. — У паляўнічых гаспадарках ужо тыдзень вядзецца пастаяннае назіранне. Падзяжу дзікіх жывёл не выяўлена.

Месцы для кармлення жывёл вызначаюць егеры, зыходзячы з назіранняў за ўчасткамі іх пражывання. Практычна ўсе кармушкі абсталяваны навесамі. У кармы дадаюць неабходныя вітаміны і мінералы, а таксама антыгельмінтныя прэпараты.

Нагадаем, што асаблівую патрэбу ў падкормках маюць дзікі, бо харчуюцца падножным кормам, здабыць які з-пад глыбокага снегу цяжка. Казулям, ласям, аленям пракарміцца зімой самастойна прасцей: ім дастаткова галінак і кары дрэў. Але і для іх збудаваны спецыяльныя кармушкі, куды выкладваюцца грубыя кармы, сілас. Акрамя гэтага, круглы год для капытных жывёл абсталююцца саланцы.

Арганізаваная таксама падкормка птушак. Больш за іншых ад высокага снегавога покрыва церпяць курапаткі. Для гэтых птушак абсталяваны спецыяльныя шалашы, каб зерне і іншы корм не замятала снегам.

**Сяргей РАСОЛЬКА**



Сардэчна віншуем **Андрэя Сяргеевіча Вяндрава** з г. Мінска з 19-годдзем. Жадаем здароўя, надзейных сяброў і добрага настрою.
**Брыгада Валянціны Касінскай адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела МАЗа.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

У ЧАКАННІ СВЯТА

## УПРЫГОЖВАЕМ ДОМ

**Заўсёды хочацца прыдумаць новыя спосабы ўпрыгожыць святочны велікодны стол.**
**Яйкі можна фарбаваць адварам з шалупіння цыбулі, можна рознакаляровымі фарбавальнікамі, якія прадаюцца ў крамах, можна распісаць іх тонкім пэндзлікам, наляпіць на фарбаваныя яйкі прыгожыя налепкі.**

### ЗЯЛЁНАЯ ТРАЎКА

Фарбаваныя яйкі выглядаюць яшчэ ярчэй на фоне зялёнай траўкі, а талерку з травой лёгка падрыхтаваць самім.

За тыдзень да Вялікадня на дно прыгожай глыбокай талеркі або блюда трэба насыпаць трохі зямлі, з зямлёй змяшаць зерне пшаніцы ці аўса, крэс-салаты. Паліць сумесь так, каб яна была, як вадкая кашка, і трымаць яе ў цёплым пакоі, паліваючы час ад часу. Калі насенне пачне прарастаць, травінкі будуць цягнуцца да святла, і талерку трэба часта паварочваць, каб трава расла прама.

Да Вялікадня талерка будзе пакрыта густой зялёнай траўкай, на якую можна пакласці фарбаваныя яечкі.





### ВЕЛІКОДНАЕ ДРЭВА

Зрабіць такое дрэва вельмі проста, і яно прынясе ў дом адчуванне вясны і свята.

Для гэтага трэба некалькі галінак, невялікае вядзерца (0,5—5 літраў) або збан, якія запаўняем каменьчыкамі і наліваем ваду, утыкаем галінкі. На галінках развешваем яйкі, папярэдне ачышчаныя ад змесціва, размаляваныя, да якіх прыклеена нітка або тасьма, на якой яны і будуць вісець. Галінкі могуць нават трошачкі зазелянець (гэта пры ўмове, вядома, што на іх паспелі з'явіцца пупышкі да таго, як іх адламалі з дрэва).

### НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЯЙКІ

Рознакаляровыя, бліскучыя велікодныя яйкі з малюнкам і са стужачкамі — арыгінальная альтэрнатыва звычайным каляровым яйкам.

Самы просты спосаб афарбаваць яйкі — з дапамогай харчовага фарбавальніка. Давесці да кіпення 3 кубкі вады і зняць з агню. Дадаць 2 ст. л. воцату і 2-3 кроплі фарбавальніка (або больш, для больш насычанага колеру). Афарбаваць яйкі, пакуль яны не стануць

-2920-



патрэбнага колеру. Дастаць з фарбы, працерці папяровым ручніком і даць высахнуць.

Фарбаваць можна як вараныя, так і сырыя яйкі. Чым больш гладкае яйка, тым лепш ляжа фарба. Перад тым, як афарбоўваць яйка, натрыце яго воцатам, каб ачысціць ад бруду і палепшыць убіранне фарбы. Для прыглушаных колераў фарбуйце карычневыя яйкі. Фарбаваць яйкі трэба заўсёды чыстымі рукамі, без крэму для рук, каб тлушч у крэме не паўплываў на ўбіранне фарбы. Калі вы збіраецеся захоўваць яйкі, іх трэба пакінуць сырымі, а затым выдзьмуць пасля афарбоўкі.



Выдзьмутыя яйкі могуць цешыць доўгі час, нават год за годам. Лепш выдзімаць яйкі пасля таго, як упрыгожванне скончана, калі толькі інструкцыі не патрабуюць зваротнага. Працуючы над міскай, пракаліце адзін канец сырога яйка іголкай. Праткніце супрацьлеглы канец, пашырце адтуліну іголкай і праткніце жаўток. З дапамогай саломінкі для кактэйлю выдзьміце вадкасць з яйка. Можна выкарыстаць шпрыц. Не давайце вадкасці дакранацца да шкарлупіны.



## ЗАКУСКА «КУРАНЯТЫ»

***Спатрэбіцца:** мякаць варанай курыцы — 200 г, 3 вараныя яйкі, 1 вараная морква, масла сметанковае — 60 г, маянэз — 2 ст. лыжкі, палова салодкага чырвонага перцу, перац гарошкам, соль па смаку.*

Яйкі разрэзаць упоперак напалам, выняць жаўткі. З яечных бялкоў зрэзаць знізу невялікую частку для устойлівасці. Мякаць курыцы і моркву здрабніць.

Курыцу і моркву злучыць з маслам, маянэзам, соллю і ўзбіць. З курынай масы скачаць шарыкі, запаніраваць іх у здробненых жаўтках. Падрыхтаваныя шарыкі ўкласці ў яечныя бялкі. З перцу выразаць «грабеньчыкі» і «дзюбы», «вочы» зрабіць з гарошын чорнага перцу. Пры падачы выкласці «куранят» на блюда, аформіць зяленівам.



-2921-

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
| --- | --- | --- | --- |
| Мінск | — 7.05 | 19.29 | 12.24 |
| Віцебск | — 6.54 | 19.19 | 12.25 |
| Магілёў | — 6.55 | 19.19 | 12.24 |
| Гомель | — 6.52 | 19.15 | 12.23 |
| Гродна | — 7.20 | 19.44 | 12.24 |
| Брэст | — 7.21 | 19.44 | 12.23 |

### Месяц

***Першая квадра 19 сакавіка.***
***Месяц у сузор'і Льва.***

### Імяніны

***Пр.** Васілісы, Галіны, Настассі, Віктара, Дзяніса, Кандрата, Купрыяна, Леаніда, Серафіма.*
***К.** Пелагеі, Конрада, Фелікса.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## УСМІХНЕМСЯ

Дзецям на заметку! Старанна ўзважвайце і абдумвайце словы, якія вы прамаўляеце ўголас. Так, фраза: «Тата, ты добры!» цягне максімум на кітайскі цацачны пісталет. А вось фраза «Тата, я хачу быць такім жа разумным, як і ты!» — гэта ўжо сур'ёзная заяўка на веласіпед.

**Шатландыя, сям'я. Жонка:**
**— У краму трэба збегаць, а я спадніцу памыла.**
**Муж:**
**— Надзень маю.**

Жаночы салат «Істэрыка».

Ірвеш лісце, душыш часнок, сячэш мяса, ломіш макарону, рэжаш фотаздымкі, спальваеш лісты, б'еш посуд, ломіш мэблю, сыплеш соль на рану, адкаркоўваеш віно, падпальваеш цыгарэту, набіраеш нумар. Заправіць слязьмі.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 25.058. Індэкс 63850. Зак. № 1288.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 22 сакавіка 2013 года.